№1(52)/2003-2004

# Беларускія Ведамасьці

ВАРШАВА, сьнежань 2003 г.—люты 2004 г.




(Фота Яўгена Шатохіна)

***Беларускія адраджэнцы на Случчыне. 2003 г.***

# БАЙКОТ

## (ЧАМУ НЕАБХОДНЫ БАЙКОТ ВЫБАРАЎ)

На кастрычнік 2004 года рэжым Лукашэнкі плянуе правесьці на Беларусі выбары ў парлямант („палаты”). Усе выбары і рэфэрэндумы, якія праводзіліся перад гэтым, паказалі, што рэжымам створана шырокая, паслухмяная і праверaная машына фальсіфікацыі галасаваньня. Ня мае значэньня, як галасуюць выбаршчыкі, важна, каб яны ўдзельнічалі ў галасаваньні. Машына фальсіфікацыі заўсёды падлічыць галасы ў сваю карысьць.

Дзейнасьць сістэмы фальсіфікацыі грунтуецца на выработаным адміністрацыйным рэсурсе, які фармуе і кантралюе ўсе выбарчыя камісіі, ад участковых да Цэнтральнай. У той жа час сам „адміністрацыйны рэсурс” цалкам і жорстка кантралюецца вышэйшай уладай рэжыму.

Грамадзкае назіраньне над галасаваньнем практычна ліквідаванае. Назіральнікаў не дапускаюць да назіраньня за падлікам галасоў, а ў большасьці выпадкаў – і да назіраньня за працэсам галасаваньня. Скаргі і пратаколы назіральнікаў не прымаюцца пад увагу.

Рэжым поўнасьцю кантралюе ўсе электронныя сродкі масавай інфармацыі і ўвесь друк (у тым ліку і так званы „незалежны”, акрамя мясцовых самадзейных лісткоў). Кандыдатаў, альтэрнатыўных рэжыму, не дапускаюць выступаць у СМІ.

Трэба ўлічыць адсутнасьць дэмакратыі ў краіне, існаваньне рэжыму дыктатуры, бяспраўе і недэмакратычнасьць Закона аб выбарах. Парлямант Лукашэнкі ня мае рэальнай заканадаўчай самастойнасьці, напалову прызначаецца і поўнасьцю кантралюецца Лукашэнкам.

У гэтай сітуацыі той, хто для рэжыму „ня свой”, праз галасаваньне не праходзіць. Машына не прапускае. Змагару з рэжымам выстаўляць сваю кандыдатуру ў такіх „выбарах” — гэта значыць выступаць у ролі дурня, ці яшчэ горай – ідыёта. Але самае дрэннае – гэта азначае падыгрываць антынароднаму рэжыму, сьцягваць яму выбаршчыкаў на галасаваньне, забясьпечваць ягонай прапагандзе аргументы для стварэньня бачнасьці нібыта „дэмакратычных” выбараў (маўляў, глядзіце, удзельнічаюць альтэрнатыўныя кандыдаты і розныя партыі).

Удзел больш паловы выбаршчыкаў у галасаваньні абазначае, што выбары адбыліся. Гэта дае магчымасьць рэжыму скарыстаць „машыну” і сфальсіфікаваць выбары, а потым гаварыць нібыта пра „адпаведнасьць закону”. Рэжым зацікаўлены, каб выбаршчыкі ішлі на выбары па ягоным сцэнары.

Зусім іншая карціна ўзьнікае, калі выбаршчыкі не прыходзяць галасаваць, байкатуюць галасаваньне. Сфальсіфікаваць выбары ў такім выпадку значна цяжэй. У выніку байкоту фальсіфікацыйная машына пракруціцца ўхаластую. ***Правал несправядлівых выбараў у выніку байкоту будзе азначаць правал рэжыму Лукашэнкі і перамогу народа.*** Гэта ўздыме дух салідарнасьці ў людзей. Грамадзтва набудзе ўпэўненасьць у сабе і здольнасьць да змаганьня. Узьнікне

іншая сітуацыя, ў якой паўстане пытаньне аб новых выбарах прэзыдэнта (без удзелу Лукашэнкі). Зьявіцца шанс скончыць з антыбеларускім рэжымам.

Зьвернем ўвагу, што ўлады рэжыму разумеюць небясьпеку байкоту для сістэмы фальсіфікацыі. Каб запабегчы правалу, яны прыдумалі (і ўнесьлі ў антыдэмакратычны закон) так званае „папярэдняе галасаваньне", якое доўжыцца цэлы тыдзень і практычна недасягальнае для грамадзкага кантролю. На працягу тыдня ўлады пад прымусам і пад пагрозай звальненьня з працы звозяць аўтобусамі людзей на выбарчыя ўчасткі і прымушаюць галасаваць. Распрацаваныя таксама мэтады прымусу для студэнтаў, навучэнцаў, ваеннаслужачых, чыноўнай бюракратыі, калгасьнікаў і г.д. У час прэзыдэнцкіх выбараў 2001 года на асобных участках (папярэдняга галасаваньня) набралі такім мэтадам больш 50% прагаласаваўшых (што зьяўляецца антызаконнай прафанацыяй выбараў). Пытаньне, як прагаласавалі такія „папярэднія" выбаршчыкі, вырашалася ў камісіях проста: некантралюемыя грамадзкасьцю ўрны з бюлетэнямі падмяняліся іншымі ўрнамі з іншымі бюлетэнямі. Так быў „зроблены" патрэбны вынік галасаваньня.

Наступны мэтад запабяганьня байкоту выбараў (які ўжываюць пераважна ў сельскай мясцовасьці) – гэта аб'езд выбаршчыкаў з пераноснымі ўрнамі для галасаваньня (галасаваньне „па дамах"). Ні ціск на выбаршчыкаў, ні напаўненьне ўрны бюлетэнямі, практычна, немагчыма ў гэтым выпадку пракантраляваць. Таму мэтадам „падворнага абходу" шырока карыстаюцца фальсіфікатары.

Аднак у гэтай сітуацыі найбольшай здрадай і небясьпекай зрыву байкоту зьяўляецца ўдзел у недэмакратычных „выбарах" нібыта альтэрнатыўных кандыдатаў ад паліртпартыяў ды групаў, якія разам з агентурай КГБ агітуюць народ ісьці на выбары і галасаваць за „апазыцыю" ды за іншых „сяброў народа", а ў рэальнасьці выкарыстоўваюць сродкі замежных датацыяў, бессаромна займаюцца так званым „палітычным бізнэсам".

Справа тут ня простая, бо „кіруемая апазыцыя" створана на Беларусі ў асноўным зьнешнімі сіламі па сумеснай праграме Менскай Місіі АБСЭ і КГБ. Аб гэтым нядаўна прызнаўся былы кіраўнік Місіі АБСЭ ў Менску (і былы кіраўнік зьнешняй разьведкі Нямеччыны) Ганс-Георг Вік *(гл. „Белорусская газета", — 2004, 12 студзеня)*. „Кіруемая апазыцыя" – гэта не адраджэнцкая апазыцыя. Яна была задумана насуперак беларускаму нацыянальна-дэмакратычнаму руху і як разбуральная альтэрнатыва Беларускаму Народнаму Фронту, які ў 1991 годзе вярнуў незалежнасьць краіны і спыніў дзейнасьць КПСС на Беларусі.

Падстаўная апазыцыя, арганізаваная Гансам Вікам і КГБ з былой намэнклатуры, з агентуры, з былых паплечнікаў Лукашэнкі, з прамаскоўскіх партыяў (тыпу АГП і камуністаў), з асобаў, што займаюцца „палітбізнэсам" і з людзей, якія дрэнна арыентуюцца ў палітыцы. Яна цалкам кантралюецца КГБ (асабліва кіраўніцтва) і фінансуецца з-за мяжы.

Менавіта замежныя функцыянеры ад палітыкі і грошадаўцы патрабуюць ад аплочаных „апазыцыянераў" удзельнічаць у ненармальных выбарах, ствараць ненармальныя „кааліцыі" і агітаваць выбаршчыкаў на заведамае ашуканства. Гэтакай бізнэс-кааліцыяй зьяўляецца, напрыклад, так званая „пяцёрка плюс" (у народзе называюць „шасьцёрка мінус"), дзе сабраліся групоўкі ад лібэралаў да камуністаў. Яны (пачуўшы пах замежных грошай) і агітуюць за ўдзел у недэмакратычных выбарах, хоць самы ж бессаромна гавораць, што ў парлямант ніхто з „кааліцыі" ня пройдзе.

У аснове замежных патрабаваньняў дзьве прычыны. Першая – гэта поўнае неразуменьне беларускай рэальнасьці, характэрнае для шмат якіх цяперашніх эўрапалітыкаў. Яны мяркуюць, што *„выбары 2004 года трэба выкарыстаць для дэмакратызацыі становішча ў Беларусі і пашырэньня правоў парляманта"*, што ў любых выбарах трэба ўдзельнічаць, каб набіраць *„палітычны вопыт"*. (Хаця зразумела, што, пасьля правядзеньня выбараў па сцэнары Лукашэнкі, іхны набыты „вопыт" нікому не спатрэбіцца, бо гэта ня вопыт, а нешта іншае).

Другая прычына больш сур'ёзная. Гэта палітычны інтэрас тых, хто дае грошы падстаўной апазыцыі і „заказвае музыку". (Напрыклад, нямецкі інтэрас у легалізацыі рэжыму Лукашэнкі і ўплываньне на яго, ці таемная падтрымка здачы Беларусі пад Расею дзеля зьмяншэньня транзітнай прасторы ды зручнага вырашэньня пытаньня з Калінінградзкай вобласьцю і г.д.)

Мой шматгадовы палітычны вопыт на Захадзе пераконвае мяне, што шмат якім эўрапалітыкам з АБСЭ ды Эўразьвязу (асабліва нямецкім) нашыя беларускія праблемы, лёс нашай незалежнасьці, беларускай мовы, беларускай культуры, беларускай эканомікі, фінансаў, а зрэшты і лёс беларускай дэмакратыі – зусім не абходзяць. Іх цікавяць толькі свае палітычныя ды эканамічныя інтарэсы ў Беларусі і ў сувязі з гэтым – свае лібэральныя паняцьці аб дэмакратыі як ***сродка забесьпячэньня інтарэсаў***.

Замежныя грошы на аплату падстаўной апазыцыі вельмі нашкодзілі беларускаму грамадзтву і будучыні беларускай дэмакратыі, бо дэмаралізавалі частку палітычна актыўных людзей.

З падстаўной апазыцыяй, з палітбізнэсам, які яна спарадзіла, і з умяшаньнем ва ўнутраныя справы Беларусі разбуральных чужых грошай і хцівых людзей неабходна змагацца ўсяму беларускаму грамадзтву. Беларускую дэмакратыю і беларускую палітыку павінны падтрымліваць не замежныя, а беларускія грошы, бо ***чужыя грошы даюцца дзеля чужых інтарэсаў***. Але трэба памятаць: ***ня грошы вырашаюць у палітыцы, а дух змаганьня***.

Аднак акрамя функцыянераў, людзей „заангажаваных" і сьведамых канфармістаў, у падстаўной апазыцыі і вакол яе ёсьць шмат асобаў, якія, магчыма, недастаткова прааналізавалі становішча, не ўсьведамляюць, у якую нядобрую справу іх цягнуць, засланяючыся гучнымі словамі і карыснымі абяцаньнямі. Менавіта гэтыя людзі могуць ацаніць рэчаіснасьць, адыйсьці ад супрацоўніцтва з калябарантамі і далучыцца да байкоту недэмакратычных, ненармальных і ўжо прадвызначаных рэжымам выбараў.

Посьпех байкоту – гэта шанс на грунтоўныя перамены ў Беларусі.

Мы, беларусы, мусім добра ўсьвядоміць тое, чаму вучыць нас (і ня толькі нас) нацыянальная гісторыя: сваю дзяржаву, сваю незалежнасьць і свой парадак мы можам стварыць толькі самы, сваім розумам, сваімі рукамі і сваімі грашыма.

Падтрымлівайце байкот антыдэмакратычных выбараў. Далучайцеся да ***Ініцыятывы „Беларуская Салідарнасьць"***, якая зыходзіць ад Беларускага Народнага Фронту і ад ягонай Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ, што арганізуе байкот. Стварайце групы ***ІБС***, агітуйце за няўдзел у несправядлівых выбарах. Рыхтуймася да новых выбараў прэзыдэнта!

*4 лютага 2004 г.* ***Зянон ПАЗЬНЯК***
***Старшыня Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"***

# ЗЬЕЗД БНФ

14 сьнежня пад Менскам адбыўся VI Зьезд Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ і VIII Зьезд Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне". Са справаздачнымі дакладамі выступілі Старшыня БНФ ***Зянон Пазьняк*** і намесьнікі старшыні: ***Юры Беленькі***, ***Сяргей Папкоў***, ***Уладзімер Старчанка***.

Зьезд меў рабочы характар і дзелавую абстаноўку. Асноўная тэма, на якой канцэнтраваліся дакладчыкі і выступоўцы, — гэта палітычныя пытаньні, праблемы дзеяньняў палітыкі па выратаваньню Беларускай дзяржавы ад разбурэньня зьнешнімі і ўнутранымі сіламі, пытаньні пэрспэктывы Беларусі, становішча ў сьвеце у сувязі з геапалітыкай, тактыка і задачы беларускага Адраджэньня.

Зьезд адбыўся на высокім узроўні, у прыхільнай і канструктыўнай абстаноўцы. Прынятыя заявы ***„Абараніць Беларусь ад страты незалежнасьці – першасная задача"***, ***„Антыбеларускі рэжым зьнішчае беларускую адукацыю"*** і дзьве пастановы аб разьвіцьці партыі і пра палітабавязкі сяброў партыі.

Выбраны кіруючыя органы. Старшынёй Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і ягонай Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ абраны Зянон Пазьняк.

Інфармацыя пра Зьезд, як звычайна, была ўсюды ўтоплена. Гнюснае пацьвельваньне (нібыта „інфармацыю") далі, як заўсёды, радыё „Лібэрці" і „Н. Ніва". Але ня дзеля інфармацыі, а дзеля стварэньня нэгатыўнага ўражаньня. Так што гэтакіх „інфарматараў" відаць за кілёмэтар.

***Інфа***

# ХРОНІКА ПАРУШЭНЬНЯЎ ПРАВОЎ БЕЛАРУСАЎ

## *ЛІСТАПАД — 2002 (працяг з №5(51)/2003)*

*1 лістапада, Барысаў.* Жалобную ўрачыстасьць, прысьвечаную Дзядам, зладзілі ў Барысаве каля мэмарыялу „Батарэі"—месцы масавых расстрэлаў (акцыя не была санкцыянаваная ўладамі). Усталявалі крыж з надпісам „Пакутнікам Беларусі". Сабралася паўсотні чалавек, пераважна сябры руху „Зубр". Тут расстрэльвалі ад 1919 да 1933 года, найперш удзельнікаў антысавецкіх бунтаў і партызанскага руху. Інфармацыя пра „Батарэі" сталася шырока вядомай дзякуючы ўспамінам ***Юркі Віцьбіча***. Упершыню барысаўскія актывісты ўсталявалі памятны крыж летась. Удзельнік акцыі ***Зьміцер Бародка*** паведаміў: „Крыж прастаяў каля месяца, і потым яго зруйнавалі. Мы спрабавалі некалькі разоў адбудаваць, але яго зносілі. Зараз мы зноў усталявалі яго". Прысутныя зладзілі супольную „Малітву за Беларусь" і чыталі вершы. Акцыя завершылася мірна.

*1 лістапада. Берасьце.* На гэты дзень былі заплянаваныя тры пікеты ў розных месцах Берасьця супраць закрыцьця ў горадзе вайсковага шпіталя. Заяўкі на іх правядзеньне падалі актывісты Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі „Народная Грамада". Берасьцейскія ўлады забаранілі правядзеньне пікетаў.

*2 лістапада.* Менск. З нагоды *„Дзядоў" Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя – Беларускі Народны Фронт* арганізавала масавыя мерапрыемствы ў Курапатах, на плошчы Якуба Коласа (ля помніка Якубу Коласу), у Лошыцы і ў так званым „парку Чалюскінцаў", на месцы энкавэдзісцкіх расстрэлаў, а таксама на Кальварыі.

Актывісты *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* арганізавалі жалобнае шэсьце ад будынку Менскага гадзіньнікавага завода ў Курапаты. Раніцай тут сабраліся актывісты Партыі (3000 чалавек) зь *Бел-Чырвона-Белымі сьцягамі* й транспарантамі: ***„Памятайма пра ахвяры расейскага тэрору!"***, ***„Курапаты – Беларускі Народны Мэмарыял"***, ***„Ушануйма ахвяраў Курапатаў!"*** ды іншымі. Выканаўца абавязкаў старшыні *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* у Беларусі ***Юры Беленькі***: „Людзі зьбіраюцца на гэтым месцы, прынамсі, ужо гадоў пяць, і сёньня мы пройдзем нашым традыцыйным маршрутам на Курапаты. Гэта сьведчыць пра тое, што ў нашым грамадзтве, у нашай нацыі ёсьць сіла, ёсьць той стрыжань, які мацуе нацыю. Гэта гаворыць пра тое, што ў нацыі ёсьць будучыня".

А палове дванаццатай калёна з жалобнымі песьнямі рушыла ў бок Курапатаў. Шэсьце суправаджаў вялікі эскорт міліцыянтаў. Удзельнікі шэсьця несьлі вялікія драўляныя крыжы, якія стануць часткай Народнага Курапацкага Мэмарыялу. Цягам некалькіх гадзінаў людзі йшлі доўгаю дарогаю на Курапаты. Увесь час ішоў дождж, але калёна не памяншалася. Людзі сьпявалі беларускія песьні, трымалі ў руках кветкі, луналі *Бел-Чырвона-Белыя сьцягі*. Каля трэцяй гадзіны калёна дасягнула Курапатаў. Там іх чакалі тыя, хто ня здолеў ўзяць удзел у шэсьці.

Распачаўся мэмарыяльны мітынг. Намесьнік старшыні *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ Сяргей Папкоў* зачытаў зварот *Зянона Пазьняка*: „Мінула 13 гадоў з таго часу, як мы паставілі перад уваходам на могілкі Курапацкі Крыж Пакуты. Цяпер тут Народны Мэмарыял. Сотні крыжоў сьведчаць пра нашую памяць, пра беларускую трагедыю і перажыты час. Тут не змываецца кроў са злачынных рук. Тутака сёньня побач з намі прысутнічае наш вядомы беларускі мастак і мой прыхільны сябра Аляксей Марачкін. Ён напісаў карціну-абраз, якую вы бачыце – ***Маці Божая Курапацкая ўсіх нявінна расстраляных***. Гэта творчы дар, ахвяра мастака пра забітых у Курапатах". Капліцу-крыж з абразом *Маці Божай Курапацкай усіх нявінна расстраляных* усталявалі побач з Крыжом *„Пакутнікам Беларусі"*. Ва ўрочышчы ля ямінаў-магілаў паўстала яшчэ 25 крыжоў.

*2 лістапада, Горадня. А*ктывісты БНФ „Адраджэньне" наведалі магілы вядомых людзей, ўсклалі кветкі да помнікаў і мэмарыяльных дошак, прымацавалі бел-чырвона-белыя сьцяжкі: каля бюста ***Адама Міцкевіча*** і ***Элізы Ажэшкі*** (якая жыла і памерла ў Горадні), каля дома ***Рыгора Шырмы*** (дзе ён жыў да 1951 года) і дома-музэя ***Максіма Багдановіча*** (у якім паэт жыў у маленстве), да шыльды ***паўстанцам Кастуся Каліноўскага***, якая знаходзіцца на будынку чыгуначнага вакзалу. (*14 сакавіка 1863 года* на вакзале адбыўся бой паміж паўстанцкім атрадам горадзенцаў і царскім войскам.) Вялікі кош з кветкамі ўдзельнікі Дзядоў паднесьлі да бюста ***Янкі Купалы***, які стаіць перад Купалаўскім унівэрсітэтам. На ўсім шляху за ўдзельнікамі Дзядоў ехала міліцэйская машына з двума чалавекамі ў цывільным.

*2 лістапада. У Менскай вобласьці* найбольшую жалобную ўрачыстасьць, прымеркаваную да Дзядоў, зладзілі ў Чэрвені (колішнім Ігумені). Сябры культурна-асьветніцкага таварыства *„Ігумень"* ушанавалі памяць расстраляных НКВД людзей ва ўрочышчы Цагельня.

Вакол Чэрвеня існуе пяць афіцыйна прызнаных месцаў расстрэлаў мірных людзей, зьдзейсьненых рускім НКВД: ***Цагельня***, ***Загор'е***, ***Высокі Стан***, ***Дубаў Мост*** і ***Кукалеўская Паваротка***. Найбольш драматычныя падзеі зьвязаны з *Цагельняй*. Тут 26 чэрвеня 1941 года энкавэдзісты расстралялі калёну зьняволеных, якіх не пасьпявалі вывезьці перад надыходам фашысцкіх войскаў. Сярод ахвяраў апрача беларусаў – літоўцы й палякі.

„Ігуменцы" ўшанавалі таксама памяць славутых землякоў: ***Станіслава Манюшкі***, *маці* ***Максіма Багдановіча Марыі Мякоты*** і кампазітара ***Міколы Равенскага***. Да помніка Манюшку і да мэмарыяльных дошак Мякоты і Равенскага ўсклалі кветкі.

*2 лістапада, Віцебшчына*. У Віцебску на Дзяды сябры *Кансэрватыўна–Хрысьціянскай Партыі — БНФ* усталявалі тры мэмарыяльныя крыжы на месцах пахаваньня ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў. Гэтыя жалобныя мясьціны знаходзяцца амаль у самым цэнтры гораду – каля Летняга амфітэатру (дзе рэжым праводзіць фэстываль „Славянскі базар"), каля вэтэрынарнае акадэміі ды побач з будынкам абласное ўправы КГБ. Гарадзкія ўлады не згадзіліся правесьці ў гэтых месцах адпаведныя дасьледаваньні ды ўшанаваць памяць ахвяраў, і таму ўшанаваньне памяці закатаваных тут людзей сталася штогадовым абавязкам сяброў *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ*. Усталяваныя імі крыжы зазвычай зьнікаюць ужо на другія суткі высілкамі міліцыянтаў або працаўнікоў камунальных службаў…

Аршанскія сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскае Партыі — БНФ* правялі жалобнае шэсьце да месца расстрэлу беларускіх грамадзянаў на ***Кабыляцкай гары***. Акцыя сталася несанкцыянаванай. Адмовілася падаць аб'яву пра шэсьце і мясцовая тэлекампанія „*Скіф*", нягледзячы на тое, што грошы за яе былі ўжо пералічаныя.

Сябры *Таварыства беларускае мовы* зладзілі памятную акцыю ў райцэнтры *Сянно* Віцебскае вобласьці на тамтэйшых могілках, дзе пахаваны адзін з заснавальнікаў БНР, беларускі паэт ***Андрэй Зязюля***. На ягонай магіле гучалі вершы ды апавяды краязнаўцаў.

Усклалі кветкі да крыжа ў вёсцы *Паляі* пад Віцебскам, дзе таксама пахаваныя ахвяры сталінскіх рэпрэсіяў, віцебская моладзь накіравалася ў гарадзкую ды абласную ўправы КГБ, дзе пакінула улёткі са словамі: „Сталінскія паслугачы з НКВД ператварылі Віцебск у брацкую магілу для соцень бязьвінных людзей. Мы памятаем і забітых, і забойцаў! Прыгледзьцеся да сябе: ці няма віны і на кім-небудзь з вас?"

*2 лістапада. Дзяды на Полаччыне* па традыцыі былі адзначаныя жалобнай урачыстасьцю ля Крыжа пакуты, усталяванага ў той мясьціне, дзе, па сьведчаньні відавочцаў, бальшавікі расстрэльвалі беларусаў. *Крыж у памяць ахвяраў тэрору* быў усталяваны 10 гадоў таму ля *Бельчыцкіх могілак*. Напачатку ён быў драўляны, і мясцовыя вандалы двойчы яго ламалі. Цяпер крыж жалезны, і ля яго штогод на Дзяды з ініцыятывы полацкай арганізацыі БНФ і грэка-каталіцкай грамады ладзяцца жалобныя ўрачыстасьці.

Полацкі гісторык *Міхась Баўтовіч* распавёў, як бальшавіцкія каты зьнішчалі вязьняў турмы НКВД, якая месьцілася ў мурах бэрнардынскага кляштару. Месца пахаваньня ахвяраў рэжыму дагэтуль ня знойдзенае. Калі на Ўкраіне і нават у Расеі гісторыкі маюць магчымасьць карыстацца архівамі і знаходзіць месцы таемных пахаваньняў, дык у нас складаць Чорную кнігу бальшавіцкіх злачынстваў забаронена.

Да прысутных зьвярнуўся магістар тэалёгіі айцец Андрэй, які казаў пра неабходнасьць духовага адраджэньня нацыі; сьвятар полацкай грэка-каталіцкай царквы Сьвятой Параскевы айцец Кліменці зладзіў у памяць бязьвінна забітых задушную адправу. Удзельнікі прасьпявалі беларускі гімн *„Магутны Божа"*.

*2 лістапада ў Магілёве* прадстаўнікі *БНФ, Маладога Фронту, Асацыяцыі*

*ахвяраў палітычных рэпрэсіяў, Таварыства беларускай мовы* ды іншых арганізацыяў усклалі кветкі ля магілёўскага *Крыжа Пакутаў*. Ушанаваць памяць ахвяраў палітычных рэпрэсіяў прыйшлі і родныя тых, хто быў расстраляны ў Магілёве. Сям'я ***Ядзьвігі Алейнікавай*** жыла ў Шклоўскім раёне і ў 1930-я гады страціла бацьку. ***Антон Каліновіч*** быў расстраляны як *„вораг народу"*. Маці Ядзьвігі абвесцілі, што мужа адпраўляюць у ссылку, і ўся сям'я рыхтавала для бацькі цёплыя рэчы. Рэчы забралі, і ніхто не сказаў, які лёс напаткаў Антона Каліновіча. Тое, што яго няма ў жывых, стала вядома толькі пасьля вайны, калі падалі ў вышук. Антона Каліновіча потым рэабілітавалі і паведамілі, што ён быў расстраляны ў Магілёве. „Нас засталося шасьцёра, нас пазбавілі права голасу... У мяне брат хацеў у пажарную вучэльню паступіць, вучыўся на *„выдатна"*. Яго не прынялі — сын *„ворага народу"*, — расказала спадарыня Алейнікава.

За спакой душы яго і ўсіх, хто пацярпеў ад палітычных рэпрэсіяў, маліліся ля магілёўскага Крыжа Пакутаў.

*2 лістапада, Гомельшчына.* На 9-м кілёмэтры шашы Гомель-Чарнігаў, дзе ўсталяваны Крыж у памяць ахвяраў палітычных рэпрэсіяў, прайшла жалобная цырымонія. Гамельчукі ўжо 10 гадоў прыходзяць сюды на Дзяды, каб узгадаць бязьвінна расстраляных. Улады рэжыму ня хочуць афіцыйна прызнаваць 9-ы кілёмэтр месцам расстрэлу ахвяраў бальшавіцкіх рэпрэсіяў, гэтак сама, як і Курапаты ў Менску.

*2 лістапада.* З Масквы ў Гомель вярнулася былая закладніца чачэнскіх паўстанцаў дзесяцікласьніца ***Вольга Протас***. Прыкладна год яна будзе знаходзіцца пад назіраньнем лекараў з-за газавай атакі расейцаў падчас штурму маскоўскага тэатра на Дуброўцы. Вольга сьцьвярджае, што чачэнцы маглі ўзарваць палац культуры, але не зрабілі гэтага.

*3-га лістапада ў Менску* працягваліся ўрачыстасьці, зьвязаныя з днём памінаньня продкаў ***Дзяды***. Каля 30 актывістаў Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ прыйшлі раніцай з кветкамі да помніка ***Якубу Коласу***, каб у дзень 120-годдзя паэта ўшанаваць ягоную памяць. Прысутнічалі і родныя Якуба Коласа, а ягоны сын ***Міхась Міцкевіч*** выступіў з кароткай прамовай.

Удзень актывісты *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ, Маладога Фронту* і *Партыі Свабоды* зь *Бел-Чырвона-Белымі сьцягамі*, кветкамі ды сьвечкамі прыйшлі да памятнага крыжа ў ***Лошыцкім Яры***. Там у 1937 годзе бальшавікі расстралялі тысячы людзей. Праваслаўны сьвятар прачытаў малітву за душы загінулых. Пасьля адбыўся памятны мітынг. У ім удзельнічалі каля 100 чалавек. У Лошыцкім Яры прысутнічала шмат міліцыянтаў.

Выконваючы абавязкі старшыні *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* у Беларусі ***Юры Беленькі*** сказаў: „Пакуль мы ў сэрцы носім памяць пра гэтыя ахвяры, пакуль носім у сэрцы духоўнасьць і дух нашага народу, да гэтай пары мы будзем жыць". Намесьнік старшыні Партыі БНФ ***Сяргей Папкоў*** прадоўжыў: „У гэтыя сьветлыя дні мы памятаем усіх нашых продкаў — тых, хто змагаўся за незалежную Беларусь. І гэтая нашая памяць дае магчымасьць адчуць, што мы беларускі народ, і мы ніколі ня зьнікнем".

Сябры *Партыі БНФ* усклалі кветкі да памятнага знаку ахвярам бальшавіцкага тэрору ў парку Чалюскінцаў і на магілы вядомых людзей на Кальварыйскіх могілках.

*4 лістапада, Віцебск.* Сябра *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ* ***Уладзімер Плешчанка*** выйграў судовы працэс. Пэнсіянер Уладзімер Нязвоненка пакараны за абразу гонару ды годнасьці спадара Плешчанкі. (7 кастрычніка ён распачаў бойку на пікеце каля „Сіняга дому" ды публічна абвінаваціў спадара Плешчанку ў прысваеньні грошай, сабраных на будаўніцтва мэмарыялу ў Курапатах.) Ул. Нязвоненка быў настолькі ўпэўнены ва ўласнай беспакаранасьці, што падчас судовага працэсу дазваляў сабе абразьлівыя ды нецэнзурныя выказваньні.

Судзьдзі Чыгуначнага раённага суду Сьвятлане Туфан, якая пэрыядычна прысуджала спадару Плешчанку штрафы за несанкцыянаваныя пікеты, упершыню давялося бараніць яго ад абразаў палітычных правакатараў. Яна прысудзіла штраф Ул. Нязвоненку ў памеры адной базавай стаўкі — 12 тысяч беларускіх рублёў (каля 6 даляраў ЗША) за абразу асобы.

*5 лістапада* суд Маскоўскага раёну Менска вынес папярэджаньне ***Сяргею П'яных*** і ***Канстанціну Хадыку*** – удзельнікам недазволенай уладамі акцыі каля сядзібы АБСЭ 29 верасьня, калі ў Менску затрымлівалі Нямцова з Хакамадай (што прыехалі з Масквы).

*6 лістапада ў Менску* ў рэдакцыі газэты *„Наша Свабода"* судовым выканаўцам было канфіскаванае абсталяваньне.

*У ноч з 6 на 7 лістапада* ў раёне Курапатаў міліцыя затрымала актывіста *Партыі Свабоды* ***З. Каўко***. Ён і яшчэ некалькі актывістаў БПС расьпісвалі агароджу кальцавой дарогі антылукашэнкаўскімі надпісамі. З. Каўко быў асуджаны судом да адміністрацыйнага арышту на 7 сутак.

*12 лістапада, Магілёў.* Магілёўская абласная арганізацыя ТБМ на працягу 2-х месяцаў пераконвала чыноўнікаў у неабходнасьці адкрыць у студзені 2003 г. адзіны ў Магілёве беларускамоўны кляс. (У верасьні магілёўскія ўлады адмовіліся адкрыць беларускі кляс на той падставе, што ў яго запісалася толькі чатыры вучні.

*13 лістапада* на сталічнай плошчы Якуба Коласа пры раздачы запрашальных улётак на акцыю 17 лістапада былі затрыманыя міліцыяй сябры Беларускай партыі свабоды ***А. Жук***, ***Д. Вільдзюк***, ***В. Гара***, ***І. Ядранцаў***.

*Лістапад.* Канфэрэнцыя „правых" здраднікаў. У Маскве не адшаравалі яшчэ кроў у тэатры, дзе па загаду гэбіста Пуціна зусім нядаўна была праведзена варварская газавая атака супраць людзей (дзе былі забітыя і скалечаныя таксама й беларускія грамадзяне), а ў сталіцу экзатычнай імпэрыі панаехалі ўжо „правыя" госьці-хаўрусьнікі зь Беларусі. Ім карцела хутчэй параіцца, як „інтэграваць" Беларусь пад расейскую акупацыю. Яны былі надзвычай шчырыя ў сваіх выказваньнях, рэпрадукаваных у прэсе. Вось **Станіслаў Багданкевіч**, ганаровы старшыня партыі АГП: „Калі я супрацоўнічаў з Лукашэнкам, знаходзячыся на пасадзе старшыні Нацбанка, то думаў (і ня толькі я), што ён павядзе краіну ў будучыню. Гэта зьвязвалася з самай шчыльнай інтэграцыяй Беларусі з Расейскай Фэдэрацыяй у вобласьці эканомікі, палітыкі, культуры… Беларуская апазыцыя (гэта зн. Багданкевіч і АГП) ў сваёй большасьці падтрымлівае вельмі разумныя прапановы Ўладзімера Пуціна аб неабходнасьці ўнясеньня карэкціровак у інтэграцыйны працэс".

Але бязьмежна шчыраваў у праявах халопскай любові да маскоўскага рэйха **Анатоль Лябедзька** (*ён жа* **Лебедько**), цяперашні старшыня АГП: „Адной зь мінулых памылак расейскага палітычнага кіраўніцтва была арыентацыя на інтэграцыю з Лукашэнкам, а не зь Беларусьсю. Як вынік, з працэсу інтэграцыі, фактычна, была выключана палітычная і эканамічная эліта нашай краіны. *(Памыляецеся, спадары, краіна ня ваша.)* Наступствам арыентацыі Расеі выключна на Лукашэнку стаў значны рост антырасейскіх настрояў у беларускім грамадзтве. Калі на пачатку 90-х гадоў у Беларусі налічваліся адзінкі, у якіх была алергія на Расею, то на сёньняшні дзень гэта сотні тысячаў людзей, сярод якіх пераважаюць моладзь і інтэлігенцыя". Лебедько заклікаў „аб'ядноць намаганьні з Расеяй па прасоўваньню да стандартаў, парамэтраў Эўразьвязу".

Нешта больш жадаючых совацца з Расеяй у Эўропе і Азіі не знайшлося: адно Лебедько, Лукашэнка ды АГП. Працягваем, аднак, цытату з Лебедько: „Расея пры пэўных умовах можа быць фактарам станоўчага ўзьдзеяньня на сітуацыю ў Беларусі. Расейскае эканамічнае заканадаўства больш лібэральнае, чым у некаторых эўрапейскіх краінах. У Расеі па многіх пазыцыях пакуль няма выніку, але ёсьць станоўчыя тэндэнцыі…"

Які, аднак, непараўнальны волат думкі, так замуціў. Больш ясна прагучаў іншы тэзіс Лебедько пра тое, што АГП спрабуе працаваць (сярод іншага) „ і на палітычным рынку Расеі". Сапраўды, ня трэба шмат словаў. Дастаткова з пэўнай рэгулярнасьцю артыкулятыўна гукаць „Купі мяне!", і расейскі кліент ня будзе пацець у чаканьні. Аглядальнік „Народнай Волі" Алесь Сіліч нават заўважыў, што „ўсе без выключэньня беларускія ўдзельнікі канфэрэнцыі зь Беларусі не забываліся паўтараць пра сваю адданасьць ідэям саюзу Беларусі і РФ, альбо хвараціта замоўчвалі гэтае пытаньне. І НІХТО (!!!) АНІ РАЗУ нават ня вымавіў такога сказу, як „незалежнасьць і суверэнітэт Беларусі".

*Лістапад.* Чыноўнікі Міністэрства сацыяльнай абароны Беларусі забараняюць везьці хворых дзяцей на лячэньне ірляндзкім гуманітарным арганізацыям, якія некалькі гадоў дапамагалі беларускім дзіцячым дамам і лячылі ў Ірляндыі за свой кошт дзяцей-інвалідаў. У канфлікт умяшалася ірляндзкая амбасада. Сакратар амбасады ***Джэймс О'Шэй*** наведаў Міністэрства замежных справаў і Міністэрства сацыяльнай абароны. Яго запэўнілі, што прымуць станоўчае рашэньне, але выніку не было. Джэймс О'Шэй зноў наведаў Беларусь.

Дырэктар праекту гуманітарнай дапамогі беларускім дзецям і старшыня ірляндзка-беларускага таварыства ***Лім О'Мара***: „Я не разумею сітуацыю, у якую мы зараз трапілі ў Беларусі. Мы шмат гадоў працавалі зь Беларусьсю і раней ніколі не было праблемаў. Цяпер гэта тычыцца Гарадзішчанскага і Чэрвеньскага дзіцячых дамоў. З 1996 году мы працуем зь беларускімі дзецьмі-інвалідамі. Мы забіралі хворых дзяцей у Ірляндыю, і там ім рабілася значна лепш. Цяпер мы сфармавалі групу зь вельмі хворых дзяцей. Сяргею пяць гадоў, а ён важыць шэсьць кіляграмаў. Аляксандру 16 гадоў, ён важыць 19 кіляграмаў. Вользе, вельмі прыгожай дзяўчынцы, 15 гадоў, яна важыць 16 кіляграмаў. Ды й астатнія дзеці вельмі хворыя. У Ірляндыі распрацаваныя вельмі добрыя праграмы для гэтых дзяцей. Ім патрэбная фізіятэрапія, спэцыяльны курс лячэньня і заняткі. Нам забараняюць іх везьці, губляецца час.

Мы шмат займаліся гэтым інтэрнатам. Толькі за год прывезьлі туды 17 канвояў з гуманітарнай дапамогай. Медычная дапамога ў Ірляндыі вельмі дарагая, і мы выдаткавалі на гэта сотні тысячаў даляраў. Цяпер нам нават не дазваляюць зайсьці на тэрыторыю інтэрнату. Я нядаўна набыў лекі, але мне сказалі, што я не магу туды нават зайсьці. Мы не разумеем, чаму так адбываецца".

*20 лістапада.* У Магілёве кожны супрацоўнік пошты мусіць падпісаць на пэрыядычныя выданьні ня менш як 400 чалавек (найперш на „Советскую Белоруссию", „Рэспубліку" і іншыя афіцыйныя газэты). Гэтага патрабуюць кіраўнікі паштовых аддзяленьняў Магілёва ад сваіх супрацоўнікаў, спасылаючыся на загад зьверху. Многія жыхары з прычыны беднасьці адмаўляюцца падпісвацца на газэты і часопісы. Супрацоўнікі пошты сьцьвярджаюць, што ў тым выпадку, калі яны ня выканаюць даведзены плян, іх пазбавяць прэміі альбо проста прымусяць пакінуць працу. Як паведаміў чыноўнік, які не назваў свайго імя, такое распараджэньне ініцыявалі мясцовыя ўпраўленьні інфармацыі выканкамаў.

*25 лістапада, Горкі.* У сярэдняй школе № 4 горада Горкі Магілёўскай вобласьці адбыўся сход бацькоў 5-клясьнікаў. У гэтай школе вучыцца ***Марыя Каралькова***, якая зь верасьня не наведвае заняткі на знак пратэсту, што навучальная ўстанова ня можа даць ёй адукацыю на роднай мове. Маці Марыі гаворыць, што бацькоўскі сход быў нібыта судом над яе сям'ёй. Маці горацкіх 5-клясьнікаў не падтрымалі ідэі Каральковых, яны рэзка прапанавалі ім ехаць у вёску альбо тэрмінова вярнуць Марыю ў школу, якую яна не наведвае з пачатку навучальнага году. Бацька-вайсковец сказаў, што на яго думку, матэматыку можна добра вучыць альбо па-ангельску, альбо па-расейку. Яшчэ адзін бацька назваў беларускую мову „абракадабрай" – такую выснову ён зрабіў пасьля таго, як яго дачка захапілася гуртком фальклёру.

Некаторыя ўдзельнікі бацькоўскага сходу ўсё ж прызнавалі права Каральковых на атрыманьне для дзяцей беларускамоўнай адукацыі, аднак у выніку ўсе бацькі сказалі, што цалкам задаволеныя цяперашнім вучэбным працэсам.

А Марыя Каралькова (пасьля яе хатняй вучобы зь беларускамоўнымі дапаможнікамі і падручнікамі) рыхтуецца да атэстацыі ў Горацкай школе №4.

*26 –27 лістапада, Віцебск.* За ўдзел ў несанкцыянаваным пікеце (які адбыўся 30 кастрычніка), прымеркаваным да Міжнароднага дня памяці ахвяраў палітычных рэпрэсіяў, судзьдзя Чыгуначнага раёну Віцебска **Сьвятлана Туфан** вынесла папярэджаньне ***Тацьцяне Зайковай***, ***Эле Канавалавай***, ***Уладзімеру Семянчукову*** — сябрам прарасейскай партыі АГП. Справу ***Фёдара Бакунова*** яна вярнула на дапрацоўку ў РАУС.

*27 лістапада, Бяроза (Берасьцейская вобласьць).* Карэспандэнтка „Газэты для вас" ***Тамара Шчапоткіна*** для артыкула, прысьвечанага продажу цыгарэтаў, фатаграфавала на рынку дзьвюх жанчын, што куплялі кантрабандны тытунь без акцызных марак. Аказалася, гэта былі супрацоўніцы пракуратуры і юрыдычнай кансультацыі, якія, замест кантролю за выкананьнем заканадаўства, спрыялі незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасьці. Яны абвінавацілі журналістку ў парушэньні заканадаўства аб друку і ў зьнявазе. Справа дайшла да суду. За „дробнае хуліганства" (гэта значыць за фатаграфаваньне) судзьдзя Бярозаўскага райсуду аштрафаваў журналістку на адну мінімальную базавую велічыню (11 тысяч 100 беларускіх рублёў).

***(Рэдакцыя „Беларускіх Ведамасьцяў"; Прэс-служба Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ. Валеры БУЙВАЛ)***

# ТАК БЫЦЬ НЕ ПАВІННА!

Калі я ў Менску сустракаю розныя незразумелыя назвы, то не магу мірыцца з тым, чаму мяняюць нашыя назвы на нейкія чужыя.

Напрыклад, крама „Мяса – малако" (№23), што на вуліцы Карла Лікбкнехта (так і засталася ад савецкіх часоў чужая назва) стала называцца па-руску — „Кадисия"(?). На вітрынах таксама ўсе этыкеткі над кожным прадуктам з гэтай назвай.

На жаль, людзі абыякавыя і не цікавяцца такімі назвамі (адкуль яны ўзяліся і навошта яны нам, беларусам, патрэбныя). Купілі ў краме, што змаглі, і пайшлі сабе.

Я зацікавілася і спытала ў прадаўцоў, што азначае гэтае слова? І пачула адказ: „Ня ведаем. А навошта нам?" Адчуваўся нейкі ўнутраны страх у гэтых дзяўчат сказаць лішняе пра гаспадара, іранца Алі, які купіў краму. Прадукты ў краме ўсе беларускія, гаспадар – іншаземец.

Другім разам я здолела ўбачыць і самога гаспадара. Ён стаяў на ганку — смуглы малады чалавек. Быў у добрым настроі. На маё ветлівае пытаньне („Што азначае слова *«кадзісія»*?") гэты самазадаволены і самаўпэўнены чужынец адказаў контрпытаньнем па-расейску: „А зачем вам надо знать?" А потым дадаў: „Так называется наша фирма."

Але я ўсё ж даведалася, што *Кадзісія* — невялікі гарадок у Іране, дзе нарадзіўся Алі, і таму даў такую назву краме. Краму гэтую ён купіў, і ня толькі гэтую, а некалькі, і жыве сабе, прыпяваючы, ня тое, што мы, беларусы, ледзь зводзім канцы з канцамі, бо ня ўсё, што тут ёсьць, нам па кішэні. Старыя бабулькі і дзядулькі, якія канчаткова яшчэ не сьпіліся, ходзяць па сьметніках і нешта там шукаюць, каб паесьці.

Калі прайсьціся па вуліцах нашага горада, такіх прыкладаў можна ўбачыць шмат, якія сьведчаць пра непавагу чужынцаў да нашай мовы, нашай культуры, гісторыі і нашых людзей.

Скардзіцца простаму чалавеку няма каму, ды і не да скаргаў, калі адна турбота – як пражыць з такімі мізэрнымі заробкамі і пры такіх вялікіх цэнах у крамах. П'юць бесперастанку сурагатнае віно („чарніла", як у нас кажуць) „мужыкі", крычаць-пішчаць на вуліцах п'яныя кабеты…

Нядаўна каля Камароўскага рынку назірала такое відовішча. Тры міліцыянты абступілі бабульку з цяжкай сумкай і давай капацца ў ёй, шукаць, ці ёсьць там на дне поўная бутэлька, бо бабулька несла пустыя бутэлькі, якія назьбірала за дзень. На яе просьбу не чапаць сумку, бо ў ёй нічога такога няма, міліцыянт выкрыкнуў: „Маўчы, а то палучыш палкай!"

Я спрабавала ўступіцца і ўгаварыць іх, каб адчапіліся ад бабулькі, але пачула: „Нам тожа нада жыць. За намі тожа наблюдают."

Усеагульны страх жыве ў душах людзей. Усе баяцца аднаго чалавека!

Дык як жа нам жыць на сваёй роднай зямлі, калі нас тут лічаць чужынцамі!?

Добрыя людзі! Ня будзьце абыякавымі да свайго лёсу, не давайце розным чужынцам ды акупантам зьдзекавацца над тым, што дадзена нам Богам – нашай зямлёй, нашай роднай мовай і нашай культурай. Даражыце сваёй чалавечай годнасьцю, бо абыякавасьць і бездухоўнасьць прывядуць нас, беларусаў, да зьнішчэньня.

***М. ЯКУЦЁНАК, жыхарка Менска (77 гадоў)***

# БЕЛАРУСАМ ТРЭБА ЗМАГАЦЦА!

Перад Другой Сусьветнай вайной, яшчэ пры Польшчы, мой дзед Адам Антонавіч Вабішчэвіч сябраваў з габрэям Фіалкам. Фіалка — гэта прозьвішча, ягонага імя ніхто ня памятае. Тады, дарэчы, на Беларусі ўжывалі слова „жыд", яно было нармальным ужытковым словам, гэтакім жа, як і слова „беларус", і ніхто з габрэяў і ня думаў крыўдзіцца.

Жыдоў тады ў вёсцы Дубай-Зарэчны было шмат, больш дзесяці сем'яў, і ў кожнай сям'і – больш за 10 душ. Яны ўсе ў асноўным займаліся гандлем, на зямлі не працавалі. І Фіалка таксама займаўся гандлем. Дзед Адам заўсёды здаваў яму лён і семя ільну, узамен браў у Фіалкі мануфактуру і розныя рэчы.

Было, што Адам Антонавіч здаў лён і семя другому жыду, за тое, што Фіалка падмануў яго, няправільна зважыўшы на шалях. Фіалка прышоў да майго дзеда з пляшкай гарэлкі і цукеркамі прасіць "пане Вабішчэвічу", каб ён так болей не рабіў, а толькі яму здаваў лён і семя, што ён ня будзе болей падманваць.

Зараз на Беларусі, на жаль, шмат п'юць, і можа скласьціся ўражаньне, што тады пілі, як зараз. Гэта ня так. Калі прышоў Фіалка, Адам Антонавіч кажа жонцы:

— Ганьдзячка, дастань тую пляшку, што мы апошнім разам не дапілі са спадаром Фіалка.

— Няўжо, пане Вабішчэвіч, мы яе не дапілі? – казаў Фіалка, добра ведаючы, што засталося больш як паўбутэлькі.

Баба Ганьдзя пачынала гаманіць, як быццам яны кожны выпілі па цэбару, але яе ўжо ніхто ня чуў. Мужчыны былі занятыя сваёй размовай. Фіалка любіў успамінаць, што кароль Вітаўт дазволіў габрэям пабудаваць у Берасьці самую вялікую сінагогу, а Адам Антонавіч любіў успамінаць словы свайго бацькі, які быў касінерам у Кастуся Каліноўскага, што беларусы наводзілі жах на маскалёў.

Зімой, калі ўжо быў сабраны ўраджай, мой дзед дапамагаў Фіалку перавозіць на санях лён у Пінск. Бывала, стаіць мароз, а Фіалка звычайна ехаў у драпавым паліто. Адам Антонавіч надзяваў кажух і выпіваў чарку гарэлкі на дарогу. Па дарозе ён яшчэ падбягаў за санямі, і таму яму заўсёды было горача, а Фіалка мерз ад холаду і пытаў:

— Пане Вабішчэвічу, чаму вам заўсёды горача?

— Таму, спадар Фіалка, што кажух ня вата, а гарэлка не гарбата, — адказваў дзед народнай прымаўкай.

Вяртаючыся з Пінску, яны везьлі мануфактуру, шкло, запалкі, сьвечкі і розныя рэчы для фіалкавай крамы.

У габрэя Фіалкі была (па цяперашніх мерках) вялікая сям'я: жонка, старая маці Фіалкі Меня, тры сыны (Гірша, Пінхет, Давід) і тры дачкі (Пешка, Марыя і Фейга). Да вайны два старэйшыя сыны нават адслужылі ў польскім войску.

Пра тое, што хто-небудзь з жыдоў мог ажаніцца на беларусцы альбо наадварот, — такога пытаньня нават не паўставала. Магчыма, гэтаму перашкаджала рэлігія. Вось праваслаўныя і каталікі – тут не было ніякіх пытаньняў. У нашай вёсцы не было касьцёла, але шмат каталікоў хадзіла ў царкву. За пяць кілёмэтраў была вёска Асавая, там быў касьцёл. І ўсе праваслаўныя хадзілі ў касьцёл. Але жыдоў ніхто ня крыўдзіў, усе жылі мірна.

Калі пачалася вайна, ўсё зьмянілася. Напачатку немцы жыдоў не чапалі, толькі склалі асобны сьпіс жыдоў. Першымі немцы пачалі расстрэльваць беларусаў, тых, што былі дэпутатамі. А восеньню пачалі зьбіраць жыдоў у гета, у тым ліку забралі і Фіалку з сям'ёй. На гэты час ён быў амаль што маральна зьнішчаны.

Мой дзед Адам Антонавіч прыбег у хату да Фіалкі і прапанаваў ім уцякаць у балота, у лясы – там яны выратаваліся б. Але Фіалка ўсё казаў, што прышоў да іх судны час, і за тое, што яны, габрэі, укрыжавалі Хрыста, іх Бог пакарае ўсіх.

Гледзячы на сыноў Фіалкі, якія былі ростам пад два мэтры і якія таксама распусьцілі нюні, было неяк прыкра. Але не было часу і Адам Антонавіч схапіў за руку малую дачку Фіалкі Марыю. На двары былі ўжо немцы. Ён выйшаў з хаты з дзяўчынкай, вядучы яе за руку. Немцы яго прыпынілі, але ён сказаў, што прыходзіў з дачкой да Фіалкі па запалкі. Мой дзед добра размаўляў па-нямецку, яго адпусьцілі.

Фіалку з сям'ёй разам з усімі габрэямі з Дубая пагналі ў столінскае гета. Марыя пражыла ў сям'і дзеда больш двух месяцаў. Аднойчы са Століна прышоў Фіалка. Яго немцы адпусьцілі, каб ён забраў сваю дачку. Трэба было бачыць Марыю, калі яна ўбачыла свайго бацьку. Ёй было добра ў сям'і Адама Антонавіча, але родных бацьку і маці ніхто не заменіць. Плакалі ўсе, калі Фіалка адыходзіў з Марыяй. Ніхто так і не мог зразумець, чаму габрэі тады ішлі ў багну, ішлі на сьмерць. Лес быў мэтраў сто ад дзедавай хаты – ідзі ў лес, і ўсё, ніхто цябе ня знойдзе. А яны ўсяроўна ішлі ў гета. Больш ні Фіалку, ні Марыю ніхто з нашых ня бачыў.

Восеньню 1942 года немцы пачалі расстрэльваць габрэяў. Каля лесу (недалёка ад Століна) яны загадалі ім капаць роў, расстрэльвалі і пхалі ў роў, нават жывых. Людзі казалі, што пасьля гэтых расстрэлаў зямля яшчэ стагнала і рухалася больш, чым тры дні.

Зараз раптам пачаліся незразумелыя галасы (найперш на радыё „Свабода"), што беларусы нібыта маюць дачыненьне да перасьледу габрэяў у час вайны. Гэта подлая хлусьня. На Палесьсі такога не было. Беларусы заўсёды спачувалі габрэям.

* * *

Цяпер, калі глядзіш на нашых людзей, то бачыш поўнае іхнае падабенства з габрэямі ваеннага часу. Беларусы зараз, як габрэі тады, не жадаюць змагацца за сваё існаваньне і ідуць на сьмерць, як жыды, лезуць у багну, ідуць у „расейскае гета". Габрэяў было шмат па сьвеце, і яны пры велізарных ахвярах усё ж захавалі сваю нацыю. Але для нашай нацыі рускае гета – гэта сьмерць. Нас, беларусаў, мала, у параўнаньні з габрэямі на ўсім сьвеце. Мы жывём у адным месцы, на сваёй роднай зямлі. Іншай зямлі мы ня маем. Беларусь – наша Бацькаўшчына, наш Дом. Трэба бараніць гэты Дом. І каб выжыць перад навалай — нам трэба змагацца.

*Лявон ВАБІШЧЭВІЧ*

# КРАМЛЁЎСКІ ГАЗАВЫ ШАНТАЖ

Студзень. Сярэдзіна зімы. На Беларусі вялікія маразы. І тут здарылася такое, чаго ніколі нідзе ні з кім у міжнародных адносінах не было. Масква аб'явіла аб рашэньні адключыць падачу газу на Беларусь.

Каб беларусам была больш зразумелая ўся нізасьць расейскага шантажу, нагадаю, што па прынятых міжнародных правілах, у выпадку канфліктнай сітуацыі паміж бакамі, падача газу ня можа быць адключана пасярод зімы. Бо гэта раўназначна раптоўнаму ваеннаму ўдару, ужываньню зброі масавага зьнішчэньня супраць мірнага насельніцтва.

Рашэньне Масквы не вынікае з рэальнай эканамічна-фінансавай сітуацыі, якая склалася ў дачыненьнях. Цынічнае і нахабнае вымагальніцтва Расеі абумоўлена толькі палітычнымі меркаваньнямі Крамля і накіраванае на стварэньне цяжкасьцяў у эканоміцы Беларусі, на разбурэньне яе сістэмаў дзяржаўнага функцыянаваньня, што мусіла б аблегчыць Маскве магчымасьць захопу беларускай нацыянальнай маёмасьці, тэрыторыі і інкарпарацыі нашай краіны ў Расею. Гэтая агрэсіўная палітыка супраць Беларусі аб'яўлена прэзыдэнтам Расеі Пуціным летам 2002 года пры нікчэмным маўчаньні краінаў АБСЭ.

Газавая агрэсія Масквы на беларускае грамадзтва і беларускі народ выклікана жаданьнем націснуць на Лукашэнку і прымусіць яго не гандлявацца, а здаць беларускую нацыянальную маёмасьць расейцам задарма. Газавая атака на Беларусь ёсьць дакладным зьлепкам (што да прынцыпу) газавай атакі рускага КГБ у тэатры на Дуброўцы ў Маскве, калі забілі 130 чалавек, і ніхто не панёс пакараньня. Прынцып рускай энкавэдзісцкай палітыкі заўсёды аднолькавы: галоўнае – мэта, жыцьці людзей значэньня ня маюць.

Расейцы разам з Лукашэнкам рыхтавалі шантаж Беларусі ўжо з 1994 года. Менавіта ў 1994-95 гадах па загаду Лукашэнкі і змове яго з Газпрамам былі пераведзеныя на газ усе беларускія кацельныя цеплацэнтраляў, што раней працавалі на салярцы, якую выпрацоўвалі два нашыя вялікія нафтакамбінаты. Пераход на расейскі газ уздаражыў усё на 30% (салярка была нам таней і выгадней). Лейцы газавага шантажу аказаліся ў Маскве, бо рэжым Лукашэнкі спэцыяльна не стараўся аб іншых крыніцах рэсурсаў энэргіі для дзяржавы.

Энэргетычная прывязка да Газпраму як да адзінай крыніцы супярэчыла стратэгічным інтарэсам Беларусі. Такія дзеяньні магчымыя толькі ў выніку карупцыі на дзяржаўным узроўні, альбо ў выніку нацыянальнай здрады і дзейнасьці супраць нацыянальных інтарэсаў Беларускай дзяржавы.

Расейскі газавы шантаж павінен наглядна ў тысяча-каторы раз паказаць беларусам, што такое для нас ёсьць імпэрская аўтарытарная Расея. Шантаж нам ня страшны. Але для прадухіленьня яго — у Беларусі павінен быць беларускі гаспадар, беларускі прэзыдэнт і беларуская незалежная ад Масквы ўлада.

*25 студзеня 2004 г.*

## *Post Skryptum*

Праз месяц, 18 лютага, маскоўцы сапраўды зрабілі тое, чаго ніхто не чакаў – адключылі падачу газу на Беларусь і далей у Эўропу, нікога не папярэдзіўшы.

Газавы тэрарызм Масквы супраць Беларусі – факт беспрэцэдэнтны і сьведчыць пра сутнасьць расейскай палітычнай агрэсіі, якая мераецца катэгорыямі вайны. ***Галоўны сэнс газавай авантуры Масквы – стварыць сабе выгадныя ўмовы для ўвядзеньня расейскага рубля на Беларусі і прымусіць свайго хаўрусьніка Лукашэнку здацца на расейскія ўмовы. Інкарпарацыя Беларусі ёсьць галоўным зьместам усяго газавага спэктаклю, дзе кожны са зmоўшчыкаў гуляе сваю вызначаную ролю.*** Авантура выгадная Пуціну якраз напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў у Расеі (бо разьлічана, што добра ўспрымецца рускім электаратам). Таксама гэта дасьць магчымасьць прамаскоўскаму рэжыму на Беларусі зноў моцна падвысіць цэны, рыхтуючы лёгкую дарогу на Беларусь рускаму капіталу і паглынаньне нашай краіны.

У гэтай разбойнай палітыцы, аднак, пуцінская Масква не пакідае месца Лукашэнку, лічачы па гэбоўскай звычцы, што лепш свайго прыслужніка душыць, чым зь ім хаўрусавацца. Адсюль – нэрвовыя паводзіны Лукашэнкі, які разьлічвае на большую ўзнагароду ад Масквы за ўсё тое, што ён натварыў зь Беларусяй.

Адключэньне газу Масквой паказала, што рэжым у Крамлі ў прынцыпе не разумее асноваў сучаснага міжнароднага гандлю. Гэта азіятчына, узровень паняцьцяў XIX-га стагоддзя. Так цяпер ня робіцца. Усе бакі павінны дамаўляцца і перамаўляцца, абмяркоўваць агульную сітуацыю, прымаць узгодненае рашэньне.

Але відавочна і другое, што Крэмль перад адключэньнем падачы газу дамовіўся зь немцамі. Бо немцы моўчкі перакінуліся на газ, што йдзе праз Украіну, і ніякіх камэнтароў не зрабілі. Тым часам у Польшчы (якую не папярэдзілі і якая нават крыху пацярпела) узьнялася бура.

На жаль, камэнтары, якія даюць польскія аналітыкі пра прычыны адключэньня падачы газу і пра дачыненьні Расеі зь Беларусяй, характарызуюцца павярхоўнасьцю, неразуменьнем прыроды расейска-беларускага канфлікту і сутнасьці справы. (Праўда, польскія ацэнкі больш прыстойныя і прафэсійныя, чым так званыя „камэнтары" беларускага радыё „Свабода", куды, як звычайна, сьцягнулі розных „мечаных" для зацямненьня справы і абароны Расеі.)

Магчымасьць узьнікненьня такіх сітуацыяў з Расеяй прадбачвалася намі даўно. Яшчэ ў 1990-м годзе *Беларускі Народны Фронт* прапанаваў канцэпцыю ***Балта-Чарнаморскай супольнасьці*** (***БЧС***) як процівагу Маскве, а потым – праект пабудовы ***Балта-Чарнаморскага нафтавага калектару*** і стварэньне паралельных газава-электрычных гандлёвых пастаўшчыкоў, каб запабегчы магчымаму шантажу з боку Расеі. Праект Калектара выклікаў нэрвовую рэакцыю ў Крамлі і быў байкатаваны (а потым і ўгроблены) урадам Кебіча.

Відавочна, што ў выніку газавага канфлікту Лукашэнку ў чарговы раз выдзелілі ролю „незалежніка", у якой ён будзе выступаць. Аднак „роля" правяраецца справай. Унутраная антыбеларуская русіфікацыйная палітыка рэжыму не зьмяняецца, ня гледзячы ні на якія „ролі". А гэта і ёсьць сутнасьць палітыкі, незалежна ад палітычных спэктакляў.

***Зянон ПАЗЬНЯК***

*20 лютага 2004 г.*

# БЕЛАРУСЬ – УСХОДНЯЯ ЭЎРОПА

Азірнемся на два гады, што мінулі (гэта значыць, на 2002-2003 г.г.). Як уладкаваўся сьвет за гэты час, што адбылося на Беларусі?

З палітычных падзеяў, якія мелі значэньне для інтарэсаў Беларусі, я б адзначыў ліквідацыю Менскай Місіі АБСЭ і галоўнае — выдаленьне ў сувязі з гэтым Ганса Віка – галоўнага архітэктара стварэньня грантавай падстаўной „апазыцыі" і разбурэньня Беларускага Народнага Фронту. Выдаленьне адыёзнай фігуры прадстаўніка нямецкіх спэцслужбаў зь беларускай палітыкі часткова аздаравіла абставіны змаганьня ў Беларусі. Але ў цэлым прысутнасьць у краіне міжнародных арганізацыяў (у тым ліку і АБСЭ) ёсьць станоўчая і неабходная зьява ў цяперашнім беларускім жыцьці.

Істотнай падзеяй стала інтэнсіфікацыя расейскай інкарпарацыйнай палітыкі ў дачыненьні да Беларусі. Гэта выявілася ў чэрвеньскіх і жнівеньскіх заявах прэзыдэнта Расеі Пуціна (зробленых у 2002 годзе) аб плянах анэксіі нашай краіны.

З пачатку 2003 г. пасьля маскоўскіх заяваў адчувалася ліхаманкавая падрыхтоўка рэфэрэндуму ў Беларусі аб прыняцьці так званага „канстытуцыйнага акту", які даў бы магчымасьць зьмяніць Канстытуцыю і пачаць анэксію па адпаведных тэхналёгіях (увядзеньне расейскіх грошай на Беларусі, захоп беларускай нацыянальнай маёмасьці расейцамі і г.д.).

Вясной-летам гэтага года грунтоўна асэнсавала і рэзка выступіла супраць рэфэрэндумных плянаў Масквы толькі *Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя – БНФ*. Па-за межамі фронтаўскай пазыцыі — альбо маўчаньне, альбо неадэкватныя дзеяньні (заклікі рыхтавацца да парляманцкіх выбараў у „палату" і т.п.). Гэта вельмі паказальная зьява, якая добра ілюструе, што абазначае на самай справе так званы „раскол" Беларускага Народнага Фронту.

У міжнародным жыцьці за гэтыя два гады адбылося некалькі вельмі сур'ёзных падзеяў, але ніводная зь іх не паспрыяла змагарнай барацьбе супраць акупацыйнай палітыкі на Беларусі.



(Фота Яўгена Кардаша)

***„Сафія Полацкая".***

Па-першае, адбылася амэрыканска-талібанская вайна ў Аўганістане, якая істотна паўплывала на дачыненьні ў сьвеце. Другая амэрыканская вайна пачалася сёлета 20 красавіка ў Іраку і набыла на цяперашні дзень ужо выразныя рысы партызанскага супраціўленьня супраць амэрыканцаў.

На жаль, спраўджваюцца мае перасьцярогі, выказаныя у верасьні 2001 года (адразу пасьля зьнішчэньня вежаў міжнароднага гандлёвага цэнтру ў Нью-Ёрку) аб неразуменьні Захадам Усходняга сьвету і аб небясьпецы партызанскай вайны, якую Захад можа прайграць. *(„Беларускія Ведамасьці", — 2001, №8/38; „Народная Воля", — 2001, 20 верасьня).* Зьнішчэньне ці зляўленьне Садама Хусэйна тут наўрад ці ў чым дапаможа. (І нават ліквідацыя Бін Ладэна ня вырашыць праблемы.)

Партызанская вайна на Ўсходзе — гэта не карыснае для нас разьвіцьцё падзеяў, бо мы, беларусы, павінны падтрымліваць Амэрыку і быць зацікаўленымі ў станоўчым пра-амэрыканскім заканчэньні збройнага канфлікту ў Іраку.

Ужо ўвосень 2001 года стала зразумела, што лібэральная Эўропа (найперш) з сваёй чэмбэрленаўскай палітыкай двайных стандартаў здрадзіла Чачэніі і, дбаючы пра свае інтарэсы, стала апраўдваць генацыд рускіх дзяржаўных тэрарыстаў, прадала чачэнскі народ дзеля сваёй эфэмернай дыпляматычнай выгады.

З усіх міжнародных падзеяў гэтага пэрыяду здача Чачэніі Захадам найбольш неспрыяльна адбіваецца на беларускім змаганьні з расейскай інкарпарацыйнай палітыкай, бо справа свабоды Чачэніі і справа незалежнасьці Беларусі ёсьць апасродкавана ўзаемазьвязаныя зьявы.

Апошняя падзея бягучага года, якая будзе мець дачыненьне да міжнародных адносінаў, — гэта парляманцкія выбары ў Расеі, пасьля якіх можна ўжо казаць ня проста пра ўладу Лубянкі ў Расеі, а пра абсалютную дыктатуру кагэбізму ў гэтай краіне.

* * *

Прыгледзімся да становішча на Беларусі і ў сьвеце. Нагадаю некалькі палажэньняў, якія ёсьць дадзенасьцю, што ляжыць у аснове разуменьня.

Ліквідацыю дыктатуры КПСС і вяртаньне дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі ажыцьцявіў Беларускі Народны Фронт, не пераняўшы ўлады ад савецкай намэнклатуры. Улада засталася ў старой каляніяльнай і прамаскоўскай адміністрацыі.

Другая дадзенасьць. Гісторыя і рэчаіснасьць паказваюць, што, незалежна ад таго, хто ажыцьцяўляе ўладу ў Расеі і хто засядае ў Крамлі (цар, царыца, фаварыт, юродзівы, тэрарыст, дыктатар, партакрат, дэмакрат, алігарх, лібэрал, камуніст, гэбіст і г. д.), палітыка Расеі ў дачыненьні да Беларусі застаецца нязьменнай: захапіць краіну і зьнішчыць усё беларускае. Тактыка ня мае значэньня гэтак жа, як і характар улады. Палітыка Расеі заўсёды аднолькавая: імпэрская, шавіністычная і вялікадзяржаўная. Бо Расея ня ёсьць *нацыянальнай дзяржавай.* Па структуры, сутнасьці і адпаведна палітыцы, па паняцьцях людзей – гэта шматковая імпэрыя, гістарычны перажытак на мапе Зямлі, небясьпечны сваёй агрэсіўнасьцю і тэрытарыяльным рэсурсам.

Беларусу, які гэтага ўсяго не зразумеў, я б ня раіў ісьці ў палітыку. Гэта небясьпечна альбо для яго, альбо для Беларусі. Цэлая плойма палітычных нягоднікаў, здраднікаў, дурняў і калябарантаў, што не маглі гэта ўсьвядоміць, супрацоўнічалі з расейскай уладай, тапталі і гробілі Беларусь. І адначасна шэрагі, масы палітычных ідэалістаў, пачынаючы ад ураду БНР і аж да беларускіх нацыянал-камуністаў, разьвіталіся са сваімі жыцьцямі ў Курапатах ды турмах ГУЛАГу, вярнуўшыся ў СССР і не захацеўшы ўспрыняць відавочную праўду.

***Расейскі імпэрыялізм ёсьць бязьлітасны і вечны вораг Беларусі і беларускай нацыі.*** Беларусам гэта трэба напісаць чырвонымі літарамі на ілбе, калі толькі яны хочуць выжыць, зьберагчы сваю Бацькаўшчыну і дзяржаву.

Наступнае, што трэба ўлічваць канкрэтна і рэальна (а не абстрактна і тэарытычна), што ўлада ў Беларусі і ў Расеі знаходзіцца цяпер у руках савецкага КГБ. Прытым у Расеі яна выробленая, поўная, усеагульная і, ад нядаўняга часу, абсалютная.

Сумяшчэньня толькі гэтых трох пазыцыяў дастаткова, каб зразумець, што мусіць адбывацца і што адбываецца на Беларусі. А гэта этнацыд беларусаў, лінгвацыд і падрыхтоўка да інкарпарацыі, якая ўскладняецца, аднак, канфліктам маскоўска-менскіх інтарэсаў.

На канфлікце інтарэсаў хоча імітаваць сваю палітыку намэнклятурная „апазыцыя", створаная Гансам Вікам. Імітатары едуць раз пораз то ў Брусэль, то ў Маскву.

Але канфлікт інтарэсаў гэта ёсьць канфлікт у межах адной палітычнай сілы савецкага КГБ. Ён узьнік у асяроддзі адной антыбеларускай каманды, якая займаецца супольнай справай – „злучэньнем" Беларусі з Расеяй. Гэтая сіла кіруе таксама ўяўным змаганьнем супраць сябе з боку „апазыцыі" Віка (што на гэбоўскім жаргоне называецца ўжо „кіруемым канфліктам").

Рэальны канфлікт на Беларусі – гэта барацьба за існаваньне Беларускай дзяржавы і нацыі паміж сіламі рускага імпэрыялізму, з аднаго боку, і сіламі беларускага нацыянальнага Адраджэньня – з другога. Усё, што наўзбоч ад гэтай барацьбы, — спрыяе Маскве і яе палітыцы. Такая лёгіка змаганьня і сітуацыі, што існуе на Беларусі.

* * *

Вынішчэньне Беларусі абумоўлена, перш за ўсё, суседзтвам з Расеяй. Але існуюць таксама іншыя геапалітычныя і палітычныя чыньнікі, якія ўплываюць на трагедыю нашай краіны.

Адной з прычынаў цяжкасьці нашага цяперашняга нацыянальнага разьвіцьця зьяўляецца тое, што доўгачаканае вяртаньне дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі ў 90-х гадах XX-га стагоддзя супала з пачаткам усеагульнага крызісу дэмакратыі ў сьвеце.

Пасьля распаду СССР у большыні эўрапейскіх краінаў ва ўладу праніклі агрэсіўныя лева-лібэральныя палітычныя праслойкі, людзі багемнага, нізкага палітычнага ўзроўню, якіх раней ніхто не ўспрымаў усур'ёз (як і ўвогуле лібэральныя партыі). Да гэтага Эўропа ведала эканамічны лібэралізм. (Мы маем тут свае засьцярогі, бачым у эканамічным лібэралізме плюсы і мінусы, але не пра гэта будзе наша гаворка.)

У канцы XX-га стагоддзя сітуацыя пагоршылася, і грамадзтва загаварыла пра лібэралізм у культуры як пра адмаўленьне ад народных і хрысьціянскіх традыцыяў культуры, этыкі і маралі, і нават – ад законаў прыроды. Лібэралізм у культуры разумее дэмакратычную свабоду як свабоду ўсяго, абсалютызуе правы індывідуальнасьці, незалежна ад этычных і ацэначных каштоўнасьцяў грамадзкай маралі.

У сьветапогляднай аснове лібэралізм у культуры апэлюе да філасофіі рэлятывізму, што дае яму магчымасьць, агулам кажучы, ўраўноўваць зло з дабром. Жыцьцёвыя ўстаноўкі асобы лібэральнага грамадзтва арыентаваныя на посьпех, узровень жыцьця – на камфорт, маральна-этычнае існаваньне – на геданізм і вострыя адчуваньні, што прыводзіць да зацыкліваньня на палавых дачыненьнях і да камплексацыі на збачэнствах.

Дэмакратычная атмасфэра і рэлятывісцкі падыход спрыялі разьвіцьцю лібэральных маргінальных групаў і пашырэньню рэгрэсу, што асабліва стала адчувацца з ростам мас-культуры і з посьпехам тэхнікі тэлебачаньня, дзе лева-лібэральныя падыходы знаходзілі асяроддзе існаваньня і сродкі прапаганды.

Дэмакратычная сістэма стварыла мэханізм пранікненьня збочанасьці ва ўладу, выплываньня маральнага дна на паверхню грамадзтва. Такім мэханізмам легалізацыі стала электаральная схема дэмакратычных выбараў. Палітыкі, змагаючыся за галасы, сталі апэляваць да маргінальных групаў дэмакратычнага грамадзтва, адмяжоўваючыся ад маралі. Найбольш шырока і бессаромна выкарыстаў гэтую схему прэзыдэнт ЗША Уільям (Біл) Клінтан. Цяпер стала за звычай, калі ўзамен за якіх пару сотняў галасоў палітыкі на Захадзе абяцаюць свабоду і льготы збачэнцам.

Пачалося перакульваньне натуральных і народных каштоўнасьцяў. У сістэме права дэмагагічна выкарыстоўваецца паняцьце свабоды, у сістэме заканадаўства – правы нацыянальных меншыняў на культурна-этнічнае разьвіцьцё (калі збачэнцы і маргінальныя групы сацыяльнай рызыкі прыроўніваюцца да этнічных меншасьцяў) і г.д.

У сістэме лібэральнай эканомікі збочанасьць уведзена ў бізнэс, стала таварам. Распуста, звыродлівыя палавыя мутацыі, адхіленьні ад прыроды і ад нармальнасьці атрымалі легальны шырокі рынак тавараў і паслуг, прыносяць мільённыя даходы.

Перш за ўсё з гэтай прычыны легалізаванае паскудства характарызуецца паўсюднай агрэсіўнасцю. Карыстаючыся ўсёдазволенасцю, яно пранікае ва ўсе поры заходняга грамадзтва, сьведама імкнецца ў сродкі інфармацыі, у палітыку і бізнэс, у рэлігію, у сістэму адукацыі і выхаваньня, разбурае мастацтва і цалкам апанавала мас-культуру, дэфармуе духоўныя адносіны людзей, разбурае сям'ю. Узьнікае цывілізацыя абсурду, у якой людзі трацяць здаровы сэнс, перасталі разумець адзін аднаго і прыроду рэчаў.

На першы погляд, складваецца ўражаньне, што Эўропа і сьвет (акрамя сьвету ісламу) перажываюць шок. Усе маўчаць, нібы паралізаваныя. Настолькі хутка і легальна адбываецца маральны рэгрэс, што людзі ня ў стане паверыць у сур'ёзнасьць абсурду і рэальнасьць зьяваў, якія разгортваюцца ў іх на вачах. Тым ня менш, гэта сур'ёзна і небясьпечна, бо крызіс дэмакратыі навідавоку. Лібэралізм не цікавіцца пытаньнямі нацыянальнага разьвіцьця. Нацыянальная культура – гэта сьмерць для расперазанага лібэралізму.

У гэтакіх абставінах дэградацыі культуры ажыцьцяўляецца цяпер ідэя „аб'яднанай Эўропы". Ідэя ня новая. Пра лёзунг „злучаных штатаў Эўропы" (перш, чым пабудаваць свой камуністычны „новы сьвет") гаварылі яшчэ ў пачатку ХХ-га стагоддзя розныя масоны і сацыялісты. Потым, у 1930-1940-х гг. за пабудову „новай Эўропы" ўзяўся Гітлер. Ідэя была нацыянал-сацыялістычная. І, нарэшце, у другой палове ХХ-га стагоддзя ўзьнік плян „аб'яднанай Эўропы". Плян без ідэі. Аб'яднаньне на падставе агульнага рынку, гандлю, вытворчасьці і дэмакратыі. Гэта значыць, на падставе той дэмакратыі, пра крызіс якой я толькі што гаварыў.

Эканамічна спустошаным краінам Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы, якія хочуць выйсьці з-пад пагрозы Расеі і паправіць сваё гаспадарчае становішча, уступіўшы ў Эўразьвяз, заходнія краіны ставяць крызісныя ўмовы ўваходжаньня. Напрыклад, прапануюць прызнаць адмаўленьне ад Бога і ад традыцыяў хрысьціянскай культуры на грамадзка-дзяржаўным і палітычным узроўні, патрабуюць прыняць законы аб свабодзе рабленьня абортаў, аб свабодзе і легальнасьці палавых збачэнцаў, аб сацыяльных льготах для іх, аб легальнасьці так званых аднаполых „шлюбаў" збочаных людзей, і нават аб „праве" для іх браць на выхаваньне чалавечых дзяцей.

Я называю рэчы, якія беларусу былі невядомыя і не маглі б прысьніцца нават у кашмарным сьне. А яны тут во, ужо зьявіліся, існуюць побач – будуецца „аб'яднаная Эўропа".

Зь 10-ці краінаў Цэнтральна-Усходняй Эўропы, якія зьбіраюцца ўвайсьці ў Эўразьвяз, толькі Польшча афіцыйна падняла свой голас у абарону нармальнасьці, Бога і традыцыяў хрысьціянскай культуры. У выніку Эўропа пачала круціць палякам пальцам каля скроні (маўляў, яны адсталыя, не дарасьлі да „культуры"). У Эўропе тут жа прынялі рашэньні, што палякаў ня будуць прымаць на працу ў эўрапейскіх краінах, што польскім служачым у сістэме ўстановаў Эўразьвязу будуць плаціць на тысячу эўра менш, што затрымліваюцца інвэстыцыі ў польскую гаспадарку і г.д.

Тым часам лібэральная эрозія польскага грамадзтва ідзе хуткімі тэмпамі. Нядаўняе сацыялягічнае апытаньне аб галоўных каштоўнасьцях палякаў дало ашаламляльны адказ. Патрыятызм быў на апошнім месцы. І гэта ў нацыі, якая мела шмат ахвяраў, змагаючыся доўга за незалежнасьць і свабоду.

Цяпер сярод польскіх палітыкаў усё часьцей гучаць выказваньні, што Польшча пасьпяшалася ўступаць, што трэба было пачакаць, стаць на ўласныя ногі, упарадкаваць краіну і ня йсьці ў Эўразьвяз на каленях.

Для нас пытаньне, аднак, у тым, ці трэба увогуле туды ісьці. Ужо выразна відаць, што ў Эўропе ствараецца новая лібэральная звышдзяржава на цалкам не жыцьцёвай аснове. Тыранія дрэні яшчэ не выяўляецца, але агрэсія ўжо ёсьць.

Эўразьвяз будуецца вакол паразуменьня дзьвюх дзяржаваў — Францыі і Нямеччыны, — якое можа скончыцца, як толькі Нямеччына набярэ сваёй патэнцыйнай моцы, а Францыя пакрыўдзіцца. Нямеччына ўжо цяпер вядзе сваю традыцыйную палітыку паразуменьня з Расеяй, гандлюецца Беларусяй, росьціць пляны пра будучыню Ўсходняй Прусіі і г.д. Усё гэта мы добра ведаем.

Як і некалі ў Польшчы і Прыбалтыцы, немцы шукаюць у нашым грамадзтве сярод сацыялістаў ды сацыял-дэмакратаў свае крэатуры ды германафілаў. Расходы невялікія, але навошта яны гэта робяць? Чаму ні Францыя, ні Англія, ні Італія, але яны, немцы? Тым часам, што нарабіў тут Ганс Вік, мы памятаем.

Цяпер у Бэрліна новая тактыка для Беларусі. Фармуюць прыхільнікаў крочыць у Эўразьвяз. Вось ваша будучыня, маўляў, — у аб'яднанай Эўропе, разам з намі. Адным словам, засталося толькі: на калені – і крокам руш.

Палітычная карціна, якую ствараюць немцы з маскоўцамі на Беларусі, такая: адны беларусы „інтэгруюцца" з Расеяй, іншыя – крочаць па шчасьце ў Эўразьвяз. Але і ў Масквы, і ў Эўразьвяза свае інтарэсы ў нашай краіне. Па-за межамі гэтых інтарэсаў і Маскве, і Эўразьвязу напляваць на Беларусь, на беларускі народ, на беларускую мову і на беларускую незалежнасьць. Дастаткова толькі пачытаць выказваньні розных „эўраваяжораў" на Беларусь (усялякіх гросэраў ды мюлеманаў), каб пераканацца ў гэтым (пра Г. Віка ўжо не ўспамінаем). Так што расейцы зь немцамі тут добра каардынуюцца.

Гэтакая сітуацыя і дачыненьні паміж Усходам і Захадам у нас існавалі апошнім часам пастаянна. Аднак усё абвастрылася, калі Маскве і Брусэлю (дакладней – Бэрліну) ўдалося аслабіць і раскалоць Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне", прыдушыць нацыянальна-вызвольныя сілы.

Невыпадкова яшчэ у 1990 годзе Беларускі Народны Фронт выступіў з ідэяй арганізацыі ў будучыні *Балтыйска-Чарнаморскай садружнасьці* краінаў, каб гарантаваць незалежнасьць іхняга нацыянальнага разьвіцьця. *БЧС* магла б стаць усходняй альтэрнатывай Эўразьвязу і палітычна дэградуючай Расеі. Гэта была разумная, вельмі добрая ідэя для ўсёй Эўропы. Але нічога, акрамя небясьпекі сваім таварным інтарэсам, Заходняя Эўропа ў гэтым ня ўбачыла. Пасьля распаду СССР Эўропа пачала праводзіць палітыку экспансіі і ўцягненьня краінаў Цэнтральна-Ўсходняй Эўропы ў Эўразьвяз, дамаўляючыся нахаду з Расеяй. Цяпер маем тое, што маем. Цэнтральна-Ўсходняя Эўропа не ўяўляе нічога адзінага, разлучаная, слабая, пасечаная на шматкі і на розныя сфэры ўплыву, яна разрываецца паміж Расеяй і Захадам.

* * *

Нашыя бліжэйшыя задачы усім нам, беларусам, павінны быць зразумелыя – любой цаной не дапусьціць страты незалежнасьці нашай краіны, зьберагчы мову, культуру, працу і маёмасьць Беларусі шляхам ліквідацыі нелегітымнай прамаскоўскай улады.

Але змагаючыся штодзень з прамаскоўскім рэжымам за нацыянальнае выжываньне і дзяржаўнае існаваньне, мы мусім улічваць становішча ў сьвеце і мець бачаньне нашай будучыні. Само жыцьцё паказвае нам, што мы павінны рабіць і як весьці свой нацыянальны рэй.

Наш шлях – незалежная моцная Беларусь. Нам ня трэба ні ўлева, ні ўправа, ні на Ўсход, ні бяздумна на Захад. Мы – Эўропа. Эўропа Ўсходняя.

Нас нічога добрага не чакае ў цяперашняй лібэральнай заходняй Эўропе. Мы там чужыя. Гэтак жа, як чужыя і ў Расеі. Мы іншыя эўрапейцы, бо не згубілі душы. Беларусь – наша Эўропа.

Але акрамя падступных палітыкаў, сквапных інтэрасантаў, дзялуноў і спажыўцоў, мы маем там, на Захадзе, мноства прыхільнікаў і добрых сяброў, якімі трэба даражыць. У нас ёсьць таксама свой інтэрас на Захадзе. Нам ня варта ўступаць у Эўразьвяз, але нам трэба, мы мусім супрацоўнічаць зь ім і з НАТО на ўзаемных умовах. Нашыя саюзьнікі – гэта нашыя суседзі, для якіх Расея ёсьць таксама агульным суседам і агульным антаганістам.

У нашай беларускай незалежнасьці, у нашай дзяржаўнасьці гістарычна не было і аб'ектыўна не існуе цяпер ніякіх сяброў, ніякіх прыхільнікаў і ніякіх спрыяльнікаў у Расеі. Там толькі непрыяцелі нашай незалежнасьці. Гэтая сумная, але відавочная аксіёма павінна вызначаць нашу пазыцыю і нашу палітыку цяпер і ў будучыні. (Добрая мяжа, мінімалізацыя эканамічнай залежнасьці ў гандлі таварамі і энэргетычнымі рэсурсамі, разьвіцьцё інфраструктуры транзіту, ахова інфармацыйнай прасторы, увядзеньне новых стандартаў ва ўзбраеньні, разбудова нацыянальнай арміі па міжнародных (эўрапейскіх) прынцыпах і г.д.)

Цяперашнія падзеі ў Летуве (справа Паксаса) наводзяць на думку, што там ажыцьцяўляецца маскоўскі плян перамены ўлады, які можна назваць праектам „Лукашэнка-2" (па аналёгіі з мэтадам захопу ўлады ў Беларусі, толькі на ролю летувіскага лукашэнкі прызначаны прэзыдэнт Паксас). Гэтыя падзеі абавязваюць нас запабегчы ў будучыні ўсялякім магчымасьцям інфільтрацыі расейскага гэбізму ў грамадзянскія і палітычныя структуры Беларусі.

Расейскі гэбізм як татальная сістэма ўлады, абапертая на татальныя

спэцслужбы, стварае вялікую небясьпеку ня толькі на Каўказе, у Сярэдняй Азіі і ў краінах Усходняй Эўропы, але і ў цэлым у Эўропе. Праўда, да чэмбэрленаўскай сьведамасьці эўрапейскіх лібэралаў гэта цяжка даходзіць.

Мы мусім добра разумець цяперашняе становішча ўнутры краіны. Мы маем перадышку на некалькі месяцаў (да канца прэзыдэнцкіх выбараў у Расеі). Пасьля гэтага, магчыма, захочуць зрабіць тое, што ў Маскве выраблена рыхтуюць цяпер, — рэфэрэндум на Беларусі аб так званым „канстытуцыйным акце". Пра гэта сьведчыць уся ўнутраная палітыка рэжыму Лукашэнкі: дэмагогія аб суверэнітэце — і адначасна вынішчэньне ўсяго беларускага, пасьлядоўная праца спэцыяльных структураў над увядзеньнем рускіх грошай і (на першы погляд, бязмозглая, але мэтанакіраваная) агітацыя вікаўскай „апазыцыі" ісьці на далёкія палатныя выбары, а на рэфэрэндуме „сказаць сваё важкае «не» трэцяму тэрміну Лукашэнкі" і г.д. (у той час калі відавочна, што на рэфэрэндум ісьці нельга).

З функцыянерамі „кіруемай апазыцыі" пытаньняў няма. Гэта „прафэсіяналы" – за „мзду" ідуць на любыя выбары і мерапрыемствы. Але кожны беларускі адраджэнец павінен ужо добра ведаць, што ва ўмовах жорсткага антыдэмакратычнага, антынацыянальнага рэжыму, пры нулявых функцыях парляманту, пры недэмакратычным выбарчым законе і некантралюемай машыне фальсіфікацыі галасаваньня, — на выбары хадзіць нельга. У такіх умовах хаджэньне на выбары ёсьць нацыянальная здрада з боку палітычных партыяў, паколькі рэжыму патрэбная партыйная статыстыка ўдзелу ў выбарах для фармальнай легітымізацыі антыдэмакратычнага выбарчага працэсу. Ніхто па-за кантролем, па-за воляй рэжыму праз такія выбары ў парлямант не праходзіць.

Эфектыўным сродкам супраць гэтага выбарчага гвалту можа быць усеагульны байкот. Нацыя не павінна хадзіць на фальшывыя выбары і рэфэрэндумы. Трэба пакінуць рэжым у падвешаным стане, паставіць яго ў нязручнае становішча, пазбавіць яго падставы для дэмагагічнай аргумэнтацыі на сваю карысьць, бо час працуе не на рэжым. Збайкатаванае галасаваньне ніхто не прызнае, як бы ні сфальсіфікавала яго адміністрацыя (ды і сфальшаваць тады цяжка, а часам і немагчыма). Байкот рэфэрэндума — гэта моцны ўнутраны ўдар па рэжыму. Гэта вынік, які дае сілу народу.

Тыя партыі і тыя партыйныя функцыянеры, што пойдуць на забойчы, антынацыянальны рэфэрэндум, тыя, што возьмуць за гэта юдавы маскоўскія ці нямецкія грошы, тыя павінны быць прыраўняныя да калябарантаў і здраднікаў радзімы, з усімі вынікаючымі з гэтага акалічнасьцямі. Прозьвішчы іхныя мусяць быць абнародаваныя і надрукаваныя. Мы ўжо мелі два антынародныя сфальшаваныя рэфэрэндумы, і ніхто яшчэ не панёс ніякой адказнасьці і ніякой кары. Я кажу „яшчэ", але час гэты прыдзе і скажа сваё важкае, справядлівае слова.

Але найперш — сьвятая воля і сьветлая будучыня Беларусі чакае на свой народ.

*14 сьнежня 2003 г.* — ***Зянон ПАЗЬНЯК***
*Варшава* — ***Старшыня Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"***

# НАЕЎСЯ РАСЕІ

Напрыканцы сакавіка 2003 года, праз горадзенскага пасярэдніка, я трапіў на працу ў Маскоўскую вобласьць на будоўлю, бо я зьяўляюся будаўніком, а ў Мастах за маю апазыцыйную дзейнасьць уладкавацца ня мог.

Працаваў на дачным пасёлку, у накірунку горада Тулы, кілёмэтраў 15 ад МКАО ў расейскага гаспадара. Са мной былі тры беларусы з Горадзенскай вобласьці (Ваўкавыск, Скідзель, Горадня). Старшымі над намі былі два інгушы.

Напачатку ў нас забралі пашпарты, як бы на рэгістрацыю, але яна зацягнулася на два тыдні, і больш свайго пашпарта я ня бачыў.

Амаль з першых дзён у мяне склалася ўражаньне, што патрапіў у нешта нядобрае. Дзён праз дзесяць пасьля пачатку працы адзін мясцовы хлопец, які таксама там працаваў, папярэдзіў мяне, што я патрапіў у рабства і што грошай не атрымаю, а магчыма яшчэ і апынуся на горшым „курорце" (гэта азначае рабства на Каўказе). Тады я вырашыў зьбегчы.

У нядзелю, калі брыгадзір са сваім памочнікам (інгушы) трохі абкурыліся „траўкі" і страцілі пільнасьць, я ўзяў мех са сьмецьцем і панёс на сьметнік ў лес і назад не вярнуўся.

Прайшоўшы кілёмэтраў трыццаць да МКАД, дабраўся да менскага напрамку і на прыгарадных цягніках даехаў да Беларусі. Толькі даехаўшы да Воршы, я неяк супакоіўся, убачыўшы шыльды на роднай беларускай мове.

***Алег ІВАНОЎСКІ***

# ГАНС ВІК КААРДЫНАВАЎ СВАЮ ДЗЕЙНАСЬЦЬ У БЕЛАРУСІ З КГБ

На пачатку года ў рускамоўнай прагэбоўскай газэце *„Белорусская газета"* (іронія назвы), якая выдаецца ў Менску, было зьмешчана інтэрв'ю сумна вядомага Ганса-Георга Віка. Ён там кажа: „Я – чалавек нумар адзін у гэтым пытаньні дачыненьняў зь Беларусяй. Я – тая абсалютна свабодная асоба, якая ведае, што адбываецца ў Беларусі, ведае, што павінна адбывацца. *(Ого!)* Менавіта мяне пытаюць, калі мова йдзе пра Беларусь і пра адносіны да яе", — бахваліцца Вік. *(„Белорусская газета", — 2004, 12 студзеня;* file://A:\hod bolszoj dyry.htm*).*

Як кажуць, ад сьціпласьці не памрэ, але рэдка прыходзіцца такое чытаць.

З усіх функцыянераў замежных спэцслужбаў ніхто не зрабіў столькі шкоды для Беларусі і для беларускай дэмакратыі, як Ганс Вік. Пра гэта мне прыходзілася казаць і пісаць пастаянна, з 1998 года, як толькі Вік разам з КГБ пачаў ствараць у Беларусі так званую „аб'яднаную апазыцыю" (агентуру ўплыву) і рыхтаваць потым так званы „перамоўны працэс" гэтай агентуры („апазыцыі") з рэжымам Лукашэнкі. Трэба было адцягнуць увагу беларускай і міжнароднай грамадзкасьці ад галоўнага – ад небясьпекі інкарпарацыі Беларусі ў Расею. І другое – (чаго хацелі Масква і Бэрлін) нэўтралізаваць нацыянальна-дэмакратычныя сілы Беларусі, тыя, што вярнулі незалежнасьць і адчынілі дарогу да дэмакратыі і самастойнага разьвіцьця краіны, менавіта – Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне", — пазбавіць яго кіруючай ролі ў апазыцыйным руху. Бо пакуль у апазыцыі да рэжыму будзе дамінаваць Фронт, датуль будзе пэрспэктыва нацыянальна моцнай і эканамічна магутнай дэмакратычнай дзяржавы Беларусі. А гэта ня трэба ні Маскве, ні Бэрліну, ні Сорасу.

У 2000 годзе на міжнароднай канфэрэнцыі ў Беластоку Ганс Вік публічна заявіў, што бачыць задачу Менскай Місіі АБСЭ пад яго кіраўніцтвам у тым, каб спрыяць уключэньню Беларусі ў Расею, бо ў Расеі, маўляў, „болей дэмакратыі". Пасьля гэтай заявы арганізацыі Беларускага Вызвольнага Руху (Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне" і ягоная Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя – БНФ) аб'явілі Г. Віка пэрсонай нон-грата і запатрабавалі ад краінаў АБСЭ і ад Нямеччыны адкліканьня яго зь Беларусі.

У апошнія гады (пасьля стамбульскага зьезду АБСЭ) нямецкая палітыка ў АБСЭ, на якую ўплываў Ганс Вік (нагадаю, былы кіраўнік зьнешняй разьведкі Нямеччыны), была накіраваная на стварэньне ўражаньня, што рэжым Лукашэнкі „дэмакратызуецца". Хацелі невялікіх, чыста фармальных, саступак ад Лукашэнкі ўзамен за прызнаньне ягонага рэжыму. Пачалі закулісныя размовы і далі магчымасьць рэжыму выйграць час, скарыстаць адміністрацыйны рэсурс і перамагчы на недэмакратычных выбарах прэзыдэнта. Пасьля гэтага Лукашэнка беспардонна вытурыў Віка. Усё гэта выглядае нават камічна (калі б не было так сумна).

Цяпер Вік пачаў прызнавацца, раскрываць таямніцы Палішынэля. З публікацыі *„Белорусской газеты"* вынікае, што на ўсю „вікаўскую апазыцыю" і на ўсе гэтыя так званыя „перамовы" з рэжымам Вік выкарыстаў каля паўтара мільёна даляраў, якія выдзеліла АБСЭ, а Эўразьвяз санкцыянаваў (адчыніў доступ да фондаў). Гэтак „дапамагалі" „дэмакратыі", а дакладней — афёры ў Беларусі. (Вось дык Вік!)

„І ўсе эўрапейскія ўрады былі ў курсе, — сцьвярджае Вік у інтэрв'ю, — не было ніякіх таямніцаў! Адзінай таямніцай было тое, што паперы падпісваў таксама шэф беларускага КГБ, іншых таямніцаў не было." *(„Белорусская газета", — 2004, 12 студзеня;* file://A:\hod bolszoj dyry.htm*).*

Вось гэта штука! (Ад нямецкага „шцюк" – п'еса, мастацкі твор.) Вік сам

прызнаўся, што ўсё гэтае стварэньне вікаўскай „апазыцыі” зь лябедзяк, калякіных, фраловых, статкевічаў ды гайдукевічаў, уся гэтая фронда ды грантаўская „публіка” стваралася ім з санкцыі КГБ, усе гэтыя „хартыі”, „маршыкі” „за лучшую жызьнь”, усе гэтыя ганчарыкі-каштуніцы і іхныя апэрэтачныя „выбары” – усё гэта, увесь гэты плян завізіраваў Віку лукашэнкаўскі Камітэт Дзяржбясьпекі, а эўрапейскія ўрады, ня ведаючы „таямніцы” нямецкага разьведчыка, фінансавалі спэцапэрацыю КГБ у Беларусі.

Ну, што ж, як кажуць, прыехалі, спадары. Але Вік ня ёсьць шчырым да канца, калі кажа: „Іншых таямніцаў не было.” Была, аднак, галоўная таямніца, пра якую Вік яшчэ не прызнаўся. Заключаецца яна ў тым, што ўсе грошыкі і ўсё, што ім рабілася, было накіравана адначасна на зьнішчэньне *Беларускага Народнага Фронту*. У гэтым, мяркую, ён мае яшчэ шанс прызнацца ў судзе пасьля таго, як будзе ліквідаваны рэжым Лукашэнкі зь ягонай падстаўной вікаўскай „апазыцыяй”, і на Беларусі ўсталюецца дэмакратычная беларуская ўлада.

Магчымасьцю выкрыцьця Віка тлумачыцца ягонае „дзіўнае” прызнаньне *„Белорусской газете”*. Вік супрацоўнічаў з КГБ, пэўна ж, не на свой страх і рызыку, а зь ведама каго трэба. Усё было разьлічана на тое, што „пераможцаў ня судзяць”. Але антыбеларуская дзейнасьць Віка была голасна раскрыта *Беларускім Вызвольным Рухам*, а Лукашэнка ў сваю чаргу, скарыстаўшы дапамогу „вялікага дыплямата”, выставіў яго зь Беларусі каленам.

Таму Вік „прызнаўся”, каб ня ўпаў цень на „каго трэба” і каб потым (калі яго абвінавацяць) яму ня трэба было б апраўдвацца. Маўляў, дык я ж пра гэта сам сказаў.

Ведаем мы гэтых „сяброў дэмакратыі”.

***Зянон ПАЗЬНЯК***

## ЗАГІНУЎ ЗЕЛІМХАН ЯНДАРБІЕЎ

13 лютага ў Катары загінуў ад узрыву падкладзенай бомбы былы прэзыдэнт Чачэніі ***Зелімхан Яндарбіеў***. Яндарбіеў быў прэзыдэнтам краіны пасьля забойства ***Джахара Дудаева***. Пасьля выбраньня на прэзыдэнта Чачэніі ***Аслана Масхадава*** і з пачаткам 2-й руска-чачэнскай вайны, ён эміграваў разам з сям'ёй.

Зелімхан Яндарбіеў – чачэнскі інтэлектуаліст, паэт, рэлігійны, грамадзкі і палітычны дзеяч. Асуджаў рускі дзяржаўны тэрарызм у Чачэніі, генацыд чачэнскага народа і захопніцкую каляніяльную вайну, разьвязаную Расеяй.

Зелімхан Яндарбіеў падвяргаўся інфармацыйнаму перасьледу і шальмаваньню з боку расейскіх спэцслужбаў, якія ўсіх чачэнскіх змагароў супраць расейскай агрэсіі называюць „бандытамі” і „тэрарыстамі”.

Улады Катара арыштавалі некалькі чалавек, вядзецца сьледзтва. Падазраецца, што забойства Зелімхана Яндарбіева – гэта справа рук расейскага міжнароднага тэрарызму.

У Беларусі падрыхтавана да друку і хутка павінна выйсьці кніга паэзіі Зелімхана Яндарбіева. Вершы пераклаў па-беларуску ***Рыгор Барадулін***.

***Тамаш РАКСА***

## УРАДУ ЧАЧЭНСКАЙ РЭСПУБЛІКІ ІЧКЕРЫЯ

Выказваю глыбокае спачуваньне і жаль у сувязі з гібельлю вялікага чачэнца, паэта і барацьбіта за незалежнасьць краіны ***Зелімхана Яндарбіева***.

Справа свабоды і незалежнасьці Чачэніі, за якую змагаўся Зелімхан Яндарбіеў і тысячы патрыётаў, завершыцца перамогай. Усе ахвяры ня будуць дарэмнымі.

З павагай і смуткам

***Зянон ПАЗЬНЯК***
***Старшыня Беларускага Народнага***
***Фронту „Адраджэньне”***

*Варшава, 15 лютага 2004 г.*

## КРЫЖ

Як сьведчаць архіўныя дакументы, ад верасьня 1939 і да пачатку вайны на тэрыторыі 5-ці новаўтвораных вобласьцяў у заходняй Беларусі камуністычны рэжым зьнішчыў 300 тысячаў жыхароў. Пад рэпрэсіі і арышты траплялі ўсе: ваеннапалонныя, большая частка якіх былі – беларусы (інтэлігенцыя, сялянства), былая польская адміністрацыя, беларускія дзеячы. За 2 дні ад пачатку вайны ў глыб Расеі зь Менску былі накіраваныя 92 чыгуначныя саставы з дэпартаванымі „заходнікамі”. Жыхароў Баранавіцкай вобласьці было вывезена ў той дзень **2723** чалавекі. Усяго за няпоўныя 2 гады савецкай улады ад баранавіцкіх ваколіц прымусова былі адарваныя каля **20** тысячаў чалавек.

Яшчэ больш трагічным быў лёс тых, хто сустрэў 1-ы дзень вайны ў турме.

Дасьледчык ***Аляксандар Татаранка*** кажа: „У першы дзень вайны 22 чэрвеня 1941 г. адбылося ў сьпешным парадку паседжаньне Бюро ЦК КПБ пад кіраўніцтвам першага сакратара ЦК **Панамарэнкі**. Тут і быў вынесены сьмяротны прысуд усім палітычным зьняволеным, што знаходзіліся ў турмах. Іх было вырашана расстраляць. У другой палове таго ж дня дэрэктыва зь Менску паступіла начальніку Баранавіцкага абласнога ўпраўленьня НКВД, і да канца дня (на працягу 5-6 гадзінаў) было выканана.”

Паводле А. Тататранкі, ёсьць некалькі месцаў, дзе прыводзілі ў выкананьне той злачынны прысуд. Адно месца пахаваньня – на тэрыторыі гораду ў раёне вуліцы Фэстывальнай і некалькі – блізу Баранавічаў, як да прыкладу, ля вёскі *Новая мыш.*

У Баранавічах у той час было 2 турмы: „Крывое кола” і „Амэрыканка”. Кожная зьмяшчала прыблізна па 5 тысячаў зьняволеных. Былі турмы і ў мястэчках *Новая мыш* і *Гарадзішча*, якія на той час зьяўляліся раённымі цэнтрамі.

Такім чынам, лічба жыхароў Баранавіцкага краю, расстраляных у 1-ы дзень вайны, сягае далёка за 10 тысячаў.



(Фота Ангеліны Масюты)

***Ідэі Лукашэнкі. Адводная труба, спэцыяльна выведзеная для затапленьня Курапатаў***

А. Татаранку ўдалося адшукаць людзей, якія бачылі, як 22 чэрвеня 41-га года з 6-ці гадзінаў вечара падвозілі грузавікамі зьняволеных, ставілі на калені і стралялі ў патыліцу, забівалі ды ськідвалі ў ямы. Але сёньня сьведкі тых падзеяў баяцца пра гэта гаварыць. Архівы, зь якіх можна было б даведацца праўду, недаступныя. Аднак сп. Татаранка паставіў мэту правесьці дасьледчыцкую працу па высьвятленьню ўсіх пахаваньняў са складаньнем базы дадзеных сьведкаў і пасьля выходзіць на афіцыйныя структуры і з дапамогай грамадзкасьці патрабаваць, каб хоць адно з месцаў тых жудасных расстрэлаў было афіцыйна прызнана ўладамі. (Хаця чаму „хоць адно”? — ўсе! — *рэд.*)

У 1989 г. актывісты *Беларускага Народнага Фронту* ў цэнтры горада (блізу Гарвыканкаму) усталявалі Крыж у памяць ахвяраў сталінскага тэрору. Гарадзкія ўлады некалькі разоў спрабавалі яго зьнесьці. Людзі нават ноччу там дзяжурылі. Урэшце быў знойдзены кампраміс: крыж перанесьлі ў невялікі сквер, непадалёк, дзе была турма „Крывое кола”. Тут зьбіраюцца на Дзяды, у іншыя памінальныя дні, каб ушанаваць памяць бязьвінна загінуўшых. Пакуль толькі Крыж згадвае пра тыя падзеі. На месцах пахаваньня ахвяраў – ніякіх знакаў няма.

***(Паводле радыё „Свабода”)***

# ПРЭС-РЭЛІЗ

*(паводле „Народнай Волі", „Нашай Свабоды" і радыё.)*

## *ЛІПЕНЬ — 2002* *(працяг з №5(51) 2003 г.)*

■ Лукашэнка праводзіць „рэфармаваньне" Нацыянальнай Акадэміі Навук. Цяпер агульны сход Акадэміі ня мае права выбіраць свайго прэзыдэнта, а Лукашэнка новага прэзыдэнта сваім указам не зацьвярджае – вось і працуе Акадэмія ўжо доўгі час без прэзыдэнта. Адмянілі таксама выбарнасьць ўсіх кіруемых пасадаў. Цяпер галоўных кіраўнікоў прызначае Лукашэнка, а драбнейшых будзе прызначаць прэзыдэнт АН. Ствараецца „вэртыкаль" Акадэміі. Акадэмік ***Радзім Гарэцкі*** заявіў: „Чаму маўчаць, як прамудрыя пячкуры, акадэмікі і член-кары – гэтыя ня шахматныя, а навуковыя каралі, зь якімі чыноўнікі абыходзяцца, як з пешкамі? Большасьць зь іх ахопленая страхам".

■ Вядомая крэатура КГБ пад назвай „Зубр" стала спэцыялізавацца на новай форме дэзінфармацыйнай дзейнасьці. 1 ліпеня ў сталіцы каля кінатэатра „Кастрычнік" зьявіліся маладзёны ў чорных накідках з надпісам „КГБ", „МВД" ды інш. Яны пачалі паліць на вогнішчы газэты, якія традыцыйна называюць „незележнымі". Пры гэтым яны разгарнулі плякаты з надпісам па-расейску і ангельску „Свабоду журналістам!" „Акцыя салідарнасьці" з рэдакцыяй *„Пагоні"* мела выразна цынічны характар і гнюсныя формы.

■ Ня раз прыходзілася чуць ад абывацеляў, што, маўляў, „усё адбылося само сабой: назалежнасьць, пашырэньне свабодаў, права на маёмасьць і бізнэс". (Што не адпавядае рэчаіснасьці, бо незалежнасьць была здабыта цяжкім змаганьнем Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце, дзейнасьцю ўсяго Народнага Фронту і вызвольных сілаў беларускага грамадзтва.) Мясцовая дыктатура, аднак, зьбіраецца ў чарговы раз нагадаць, што калі не бараніць свае правы, то іх лёгка зьліквідаваць, вярнуўшы *статус кво*. Гэта тычыцца, напрыклад, свабоды перасоўваньня, якую за апошнія 10 гадоў шмат хто пачаў лічыць натуральным правам беларускага грамадзяніна, забыўшыся на нядаўнюю савецкую няволю. Хаця МУС Беларусі пакуль адбрэхваецца: „гаварыць на гэтую тэму мы не ўпаўнаважаныя", але адтуль ужо паступаюць зьвесткі пра падрыхтоўку ўвядзеньня (як у савецкі час) двух пашпартоў: унутранага і замежнага. Прычым спачатку замежны будуць выдаваць асобам, дзейнасьць якіх зьвязаная з замежжам (можна сабе ўявіць, якія будуць стаўкі хабару за такі дакумант ад звычайных грамадзянаў).




***Слонім. Касьцёл сьв. Андрэя.***

■ У сярэдзіне ліпеня завершыўся прафсаюзны „палацавы пераварот". Спачатку абласныя арганізацыі ФПБ па чарзе здалі пасьляганчарыкаўскага лідэра Франца Вітко з дыягназам „ня ўмее наладзіць дыялёг з урадам і прэзыдэнтам". Потым і зусім адправілі яго ў адстаўку разам з усім бюро. Новым лідэрам славутай „школы камунізма" быў абраны адзін з ключавых **лукашыстаў Леанід Козік**. Цяпер зразумела, хто арганізаваў гэтую „зачыстку".

■ Новы лідэр ФПБ Л. Козік (у народзе – Козьлік) імпэтна ўзяўся за рэфармаваньне сваіх прафсаюзаў. Пачаў з выдаленьня галоўнага рэдактара прафгазэты *„Беларускі час"* ***Аляксандра Старыкевіча***, аднаго з выдатных беларускіх журналістаў.

■ „Истинно русский человек" **Уладзімер Ярмошын** (былы лукашэнкоўскі прэм'ер) не прапаў пасьля сваёй адстаўкі. Цяпер ён узначаліў прадстаўніцтва расейскага АТТ „Мабільныя тэлесістэмы" ў Беларусі.

■ У нашай краіне ўзьнікла яшчэ адна „працоўная дынастыя" (або футра з царскага пляча). 31 ліпеня **Людзьміла Пастаялка** прызначаная новым міністрам аховы здароўя. Яе галоўная прафэсійная рыса ў тым, што яна маці асабістага лекара Лукашэнкі.

## *ЖНІВЕНЬ — 2002*

■ У ліпені ў Бэрліне на сэсіі Парляманцкай Асамблеі АБСЭ ўручылі прэміі АБСЭ „За журналістыку і дэмакратыю". Ляўрэатаў было двое: адзін аўстрыец за рэпартажы з Югаславіі (антываенная кінадрама пра народную бяду) і шумнавядомы **Павел Шарамет**, як напісала „Народная Воля", — „россиянин с белорусскими корнями". Чытаючы ўзнагароднае паведамленьне пра „коренного" беларуса, мы былі ўпэўненыя, што прэмія яму даецца за рэпартажы з Чачэніі (памятаеце, „наши доблестные войска истребили чеченских террористов..." Ажно не: Шарамет даслужыўся да прэміі з падачы **Ганса Віка** за рэпартажы пра зьнікненьні людзей. Мы зноў падумалі, што ён зрабіў у Маскве фільм пра беларусаў, якія назаўжды згінулі, прыехаўшы працаваць у Маскву і Маскоўскую вобласьць (***штогод так гіне ў Масковіі больш за 300 беларускіх грамадзянаў***). Аж не, ён усё пра тое самае: пра „громкие исчезновения" былых лукашэнкаўскіх палітыкаў (астатняе – не ў рахубу).

Хто ж зоймецца рассьледваньнем трагічнага лёсу тысячаў беларусаў, якіх ў апошнія гады заглынула жудасная расейская гідра?

Але ня гэта было галоўным у анонсе пра Шарамета. „Набытак" расейскага TV тэарэтызаваў на глябальныя тэмы. Вось цытата: „Я думаю, што расейска-беларускія адносіны будуць разьвівацца ў залежнасьці ад таго, як пойдзе прыватызацыя беларускіх прадпрыемстваў з удзелам расейскага капіталу. Калі гэта будзе спрыяльны для расіянаў працэс, то і адносіны будуць больш ці менш нармальнымі. Калі жорсткі – то і адносіны будуць жорсткімі."

Вось так – „кашалёк ці жыцьцё". А не, дык адносіны будуць жорсткімі. То ж бо, вось пра каго і пра што трэба здымаць фільмы.

***Валеры БУЙВАЛ***

## ЗЬМЕСТ

1. Байкот. *З. Пазьняк* . . . . . 1
2. Зьезд БНФ. *Інфа* . . . . . 2
3. Хроніка парушэньняў правоў беларусаў. . . . . 3
4. Так быць не павінна. *М. Якуцёнак* . . . . . 5
5. Беларусам трэба змагацца. *Л. Вабішчэвіч* . . . . . 5
6. Крамлёўскі газавы шантаж. *З. Пазьняк* . . . . . 6
7. Беларусь – Усходняя Эўропа. *З. Пазьняк* . . . . . 7
8. Наеўся Расеі. *А. Іваноўскі* . . . . . 10
9. Ганс Вік каардынаваў сваю дзейнасьць у Беларусі з КГБ. *З. Пазьняк* . . . . . 10
10. Загінуў Зелімхан Яндарбіеў. *Т. Ракса* . . . . . 11
11. Ураду Чачэнскай Рэспублікі Ічкерыя. *З. Пазьняк* . . . . . 11
12. Крыж . . . . . 11
13. Прэс-рэліз. *В. Буйвал* . . . . . 12

Беларускія Ведамасьці

Беларускае выданьне

У супрацоўніцтве зь Беларускім Выдавецкім Таварыствам ў Амэрыцы

**Рэдакцыя: Зянон Пазьняк, Галіна Палачаніна**

**Адрас рэдакцыі: 02-017 Warszawa, Al. Jerozolimskie 125/127**

**тэл./факс: (+48 22) 628 76 73**